Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 112 (4016)
НЯДЗЕЛЯ, 26 КРАСАВІКА 1931 г.
Цана нумару 5 коп.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА

Толькі 9 проц.

закантрактавана па аднаасобным сэктары

ВАЛЫНЦЫ, 18 (ад наш. спец. кар.). Пры правядзеньні кантрактацыі па Боркавіцкім раёне зусім выпала з кола дзейнасьці кантрактацыя ў аднаасобным сэктары.

— Кантрактуюць калгасы, ну і добра.

Справа кантрактацыі ў аднаасобным сэктары з прычыны правааапартуністычнай практыкі райкалгассаюзу і палітычнай недапушчі гэтага ўсяго партэрганізацыяй поўнасьцю правалена.

Калі па калгасах ільну закантрактавана 96 проц., то ў аднаасобным сэктары лодзь больш паказальнік ад пункту замарваньня —0,4 проц. кантрактацыі ільну. Бульбы па аднаасобным сэктары закантрактавана толькі 9 проц.

Важнейшыя дырэктывы партыі і ўраду ў справе кантрактацыі сярод аднаасобнікаў па Боркавіцкім раёне праваленны.

Мы патрабуем неадкладнага прыцягненьня да судовай адказнасьці праўленьня Боркавіцкага райкаапсаюзу.

Раённая партарганізацыя на чале з Боркавіцкім РК КП(б)Б павінна нарэшце сапраўды ўзяцца за ажыцьцяўленьне важнейшых дырэктыў партыі.

А. Л.

Сельсавет суцэльнай калектывізацыі

ГОМЕЛЬ. (ПА ТЭЛЕГРАФУ). КАРНАЛІНСКІ СЕЛЬСАВЕТ НА 6-ГА ЧЫРВОНАЙ КАЛЯКТЫВІЗАВАНЫ НА 98% АБАГУЛЕНА ПОЎНАСЬЦЮ НАСЕНЬНЕ І ЖЫВЕЛА.

ІЛЬНАЗАГАТОЎКІ ВЫКАНАНЫ НА 117 ПРОЦ. КАЛГАСЬНІЮ ВЫКІНАЮЦЬ ПАСЬЛЕДВАНЬ ІХ ПРЫКЛАДУ ГОМЕЛЬСКІ РАЁН.

М.

25-ты ДЗЕНЬ ГЕНЭРАЛЬНАЙ ПРАВЕРКІ

НІЯКАЙ ЧАРГОВАСЬЦІ!

Праводзячы ўдарнымі тэмпамі сяўбу, па-бальшавіцку змагацца за магутнае нарастаньне калгаснага прыліву

АПОШНЯЯ ДЭКАДА ДАЛА ЗЬНІЖЭНЬНЕ ТЭМПАЎ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ

НА 20-ГА КРАСАВІКА КАЛЕКТЫВІЗАВАНА 24,1 БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ ДВАРОЎ. ПРЫРОСТ ЗА АПОШНЮЮ ДЭКАДУ 1 ПРОЦ. СУПРОЦЬ 1,9 ПРОЦ. ЗА ПАПЯРЭДНЮЮ ДЗЕСЯЦІДНЕЎКУ

Бязьлітасна змагаючыся з апартуністамі, рашучай ачысткай калгасаў ад кулакоў, укараненьнем зьдзельшчыны, ацэненай у працаднёх, і шырокай папулярызацыяй новага закону аб с.-г. падатку даб'емся поўнага выкананьня плянаў калектывізацыі і веснавой сяўбы

Менск, 26 красавіка

На поўдні БССР **ПАЧАЛАСЯ** сяўба. У Жыткавіцкім раёне ўсе калгасы выйшлі ў поле. Аналёгічныя паведамленьні паступілі з іншых паўднёвых раёнаў. Сяўба разгортваецца. Аднак, атульны стан падрыхтоўкі да сяўбы ўсё яшчэ зьяўляецца **ЗУСІМ НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧЫМ.**

Самі паўднёвыя раёны прыступілі да палявых работ з **невыстарчальна** падрыхтаванай матар'яльнай базай. Насенныя і кармовыя фонды поўнасьцю не сабраны. Далёка ня ўсе калгасы перайшлі на зьдзельшчыну, ацэненую ў працадніёх. Абязьлічка ў большасьці с.-г. арцеляй не ліквідавана. Трэба ўлічыць сур'ёзныя памылкі паўднёвых раёнаў і неадкладна **ВЫПРАВІЦЬ** усе прарывы ў падрыхтоўцы да веснавой сяўбы. А гэтыя прарывы, як паказваюць сёнешнія матар'ялы з месц, **ГЛЫБОКІЯ і СУР'ЁЗНЫЯ.** Больш чым 20 процантаў калгасаў, асабліва новаарганізаваных, ня маюць насеўных плянаў. Збор насеньня праходзіць недапушчальна слаба. Калгасы стварылі насенныя фонды толькі ў разьмеры 57,7 проц. І да гэтага часу ня скончан рамонт трактараў і с.-г. інвэнтару. Усяго 1890 с.-г. арцеляй перайшло на зьдзельную работу (43,2 проц. пляну). Кантрактацыя яравых праводзіцца марудней шымі тэмпамі. Падрыхтоўка да сяўбы на індывідуальным сэктары разгортваецца ганебна. Насеўныя пляны даведзены ўсяго да 86,6 проц. аднаасобных гаспадарак.

Нельга больш цярпець такога становішча. У самыя бліжэйшыя дні падрыхтоўка да веснавой сяўбы павінна быць цалкам і поўнасьцю **ЗАВЕРШАНА.** Гэта работа, як і сама сяўба, не павінна ні на адну хвіліну адбывацца ад самай упартай, самай настойлівай барацьбы за новы калгасны прыліў. **ЗЛУЧЫЦЬ СЯЎБУ З АРГАНІЗАЦЫЯЙ НОВАГА ПРЫЛІВУ Ў КАЛГАСЫ — НАЙВАЖНЕЙШАЯ ЗАДАЧА.**

Апошняя дэкада дала **зьніжэньне** тэмпаў калектывізацыі. Гэта трывожны сыгнал. Ня гледзячы на пачатак сяўбы большасьць раёнаў да сёнешняга дня **НЯ ВЫКАНАЛА** баявой дырэктывы партыі — **калектывізаваць да пасеўнай кампаніі ня менш 30 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.** Многія раёны сустракаюць сяўбу з ганебна мізэрным процантам калектывізацыі. Яны, як і раней, цягнуцца ў глыбокім тыле калгаснага руху, узяўшы правааапартуністычную стаўку на самацёк. Яны ня здолелі па-бальшавіцку злучыць падрыхтоўку з арганізацыяй новага калгаснага прыліву. Партыйныя арганізацыі гэтых раёнаў не разгарнулі рашучай барацьбы за новы прыліў супроць правых і «левых» апартуністаў, супроць кулацтва. Цяпер жа, у сувязі з пачаткам сяўбы, у цэлым радзе арганізацый гуляе апартуністычная «тэорыйка» аб неабходнасьці «адкласьці барацьбу за новы прыліў да сканчэньня веснавой пасеўнай кампаніі».

— Сяўба патрабуе шмат сіл і энэргіі. Усю ўвагу трэба накіраваць на правядзеньне веснавой сяўбы, а потым ужо зноў узяцца за арганізацыю новага калгаснага прыліву, — такія разважаньні чутны ўсё часьцей і часьцей. Відавочна ўся **праваапартуністычная кулацкая сутнасьць гэтых разважаньняў.** Спроба ўстанавіць чаргу ў барацьбе за новы прыліў, мэханічна адарваць сяўбу ад арганізацыі новага калгаснага прыліву **толькі дапамагае кулаку.** Тэндэнцыя паасобных арганізацый і калгасаў адкласьці калектывізацыю да сканчэньня сяўбы — **самае шкодная праўленьне правага апартунізму на практыцы.** З такімі разважаньнямі, з такімі тэндэнцыямі трэба неадкладна разгарнуць самую суровую, самую бязьлітасную барацьбу. Работнікаў, якія пад шыльдай правядзеньня веснавой сяўбы тармозяць і зрываюць новы прыліў, трэба бязьлітасна выкрываць і біць, як кулацкіх агентаў.

Усе сілы трэба кінуць на барацьбу за ўцягненьне новых аднаасобных бядняцка-серадняцкіх мас у калгасы. Сяўба, якая пачалася толькі што, яшчэ больш узмацніе і падкрэсьлівае ўсё вялізарнае значэньне гэтай задачы. **Сяўба — самы спрыяючы момант для новага магутнага ўздыму калгаснага прыліву.** Кожная партыйная арганізацыя, уся калгасна-каапарацыйная сыстэма, усе сельсаветы, усе калгасы павінны скарыстаць сяўбу для максымальнага ўзмацненьня тэмпаў калектывізацыі. Трэба па-бальшавіцку змагацца за тое, каб новыя масы аднаасобнікаў выйшлі ў поле **КАЛЕКТЫЎНА.**

Мацней агонь па апартуністычных рагатках на шляху калектывізацыі.

Ня менш чым 30 процантаў бядняцка-серадняцкіх гаспадарак БССР павінны правесьці другую бальшавіцкую сяўбу **калектыўна.**

Рашуча ўзмацняючы барацьбу з кулаком і яго прана «лявацкай» агентурай, вышэй узьнімем тэмпы калгаснага прыліву, забясьпечым перамогу другой калгаснай сяўбы.

БЮЛЕТЭНЬ № 22

Сяўба пачалася. Адзін за другім паўднёвыя раёны БССР уключаюцца ў сяўбу. Між тым, зводка Наркамзему на 20 красавіка паказвае, што па асноўных паказальніках падрыхтаванасьці да другой бальшавіцкай вясны зруху яшчэ няма.

Дырэктыва партыі аб калектывізацыі да вясны 30 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак большасьцю раёнаў ня выканана.

На 20 красавіка па БССР налічвалася 6.500 калгасаў, якія яднаюць 187.458 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, што складае толькі 24,1 проц. калектывізацыі.

Да гэтага часу рад раёнаў яшчэ апартуністычна бязьдзейнічае ў сэнсе хутчэйшага давядзеньня пасеўных плянаў да калгасаў і аднаасобных гаспадарак. У выніку на 20 красавіка 20,9 проц. усіх калгасаў ня мелі пасеўных плянаў, не ведалі, як распачаць падрыхтоўку да сяўбы.

Да паасобных гаспадарак пасеўныя пляны даведзены таксама толькі на 86,6 проц. Асабліва слаба давядзеньне пасеўных плянаў праходзіць па новаарганізаваных калгасах.

Ход стварэньня насенных фондаў не забясьпечвае пасьпяховага правядзеньня веснавой сяўбы. Па калгасах плян ссыпкі насенных фондаў выканан толькі на 57,7 проц. Яшчэ горш ссыпаюцца страхавыя фонды: па калгасах плян выканан на 36,9 проц., па аднаасобным сэктары—на 20,7 проц.

Стварэньне кармавых фондаў таксама разгортваецца вельмі марудна. Дагэтуль сабрана 39,7 проц. канцентраваных кармоў і 23,4 проц. грубых кармоў.

Гэтыя лічбы сьведчаць аб тым, што раёны да гэтага часу яшчэ не аддалі належнай увагі мабілізацыі ўнутраных кармавых рэсурсаў.

Ня гледзячы на сяўбу, якая ўжо распачалася, усё яшчэ ня скончана ачыстка насеньня. Калгасы ачысьцілі толькі 81,5 проц. свайго насеньня, аднаасобнікі—51,3 проц.

Рамонт трактараў і с.-г. інвэнтару таксама яшчэ поўнасьцю ня скончан.

Усе гэтыя прарывы павінны быць неадкладна ліквідаваны. Да 1 мая раёны БССР павінны рапартаваць партыі і ўраду аб поўнай гатоўнасьці спаткаць другую бальшавіцкую вясну.

„ЧЫРВОНЫЯ СВАТЫ" ВЯРБУЮЦЬ НОВЫХ КАЛГАСЬНІКАЎ

ГРЭСК, 24. (Па тэлефоне). Партячэйка калгасаў Першамайскага сельсавету: «Будзённага», «Пралетарская рэвалюцыя», «1 Мая», «Чырвоная Ніва» з мэтай пашырэньня калгаснага прыліву арганізавала «чырвоныя сваты». Брыгады з калгасьнікаў заходзілі да аднаасобнікаў беднякоў і сераднякоў у хаты і «сваталі» іх у калгасы. «Чырвоныя сваты» растлумачвалі аднаасобніку выгаднасьць калгасу на канкрэтных прыкладах-данага калгасу. У выніку правядзеньня работы «чырвоных сватоў» за адзін дзень у калгас уступіла 12 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. «Чырвоныя сваты» працягваюць сваю работу.

Цімафей Макарэнка.

Сельсавет суцэльнай калектывізацыі

ПАШЫРЫЦЬ МЭТАДЫ ВЯРБОЎКІ САРАГОЎСКАГА С.-С.

СЛУЦАК (наш кар.). **Сарагоўскі** сельсавет ідзе ў першых радох змагароў за суцэльную калектывізацыю. **57 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак сельсавету ўжо аб'яднаны ў калгасы.** Гэтыя посьпехі дасягнуты дзякуючы шырокай масавагістацыйнай рабоце, якая была праведзена ў сельсавеце.

На прадагу апошняга тыдню 2 вярбовачныя брыгады завербавалі 50 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Вялікую дапамогу справе арганізацыі сельсавету аказала брыгада слуцкай прафтэхнікумы, якая ўжывала мэтад падворнага абходу. Гэты мэтад сябе цалкам апраўдаў. За два вечары ў калгас было ўцягнута 20 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Калгас «Будаўнны» ўцягнуў у калектыў усю вёску **Баславічы.**

Мэтады Сарагоўскага сельсавету павінны быць распаўсюджаны на **ўсе** іншыя сельсаветы Случчыны.

Ж.

УСТУПЛЕНЬНЕМ У КАЛГАСЫ

адказвае сялянства Касьцюковіцкага раёну

на пастановы ўраду аб арганізацыі МТС

КАСЬЦЮКОВІЧЫ. На пастанову ЦВК БССР аб арганізацыі машына-трактарнай станцыі на тэрыторыі **Касьцюковіцкага** раёну **беднякі і сераднякі** адказваюць масавым **уступленьнем у калгасы.** У Хоцімскім сельсавеце пасьля паведамленьня аб арганізацыі МТС 26 **бядняцка-серадняцкіх гаспадарак** падалі заявы аб прыняцьці іх у калгас.

У весны **Кісялёўка** пасьля інфармацыі аб арганізацыі МТС у калгас уступіла 11 **бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.**

П. Д.

Боркавіцкі—на ўздыме

Рашуча ўдарыць па правых апартуністах і „левых" загібшчыках. Арганізавана вывесьці калгасы на бальшавіцкую сяўбу

БОРКАВІЧЫ. (Ад наш. спец. кар.). Апошнія дзьве дэкады далі значны зрух у справе калектывізацыі па Боркавіцкім раёне. Калі з 20 лютага па 20 сакавіка прырост калектывізацыі складаў толькі 1,8 проц., дык ужо апошняя дэкада сакавіка дае прырост на 6,86 проц. На 1 красавіка па раёне ў калгасах знаходзілася 1854 бядняцка-серадняцкія гаспадаркі, або **31,76 проц.**

У першую дэкаду генэральнай праверкі процант калектывізацыі па раёне ўзрос да **35,1.** Няпоўныя весткі, якія ёсьць аб ходзе калектывізацыі па раёне, паказваюць, што **на 15 красавіка процант калектывізацыі перавысіў 38 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак раёну.** Калі дзьве дэкады таму назад па раёне было толькі 38 калгасаў, дык зараз іх ёсьць 74. **У першых радох** барацьбітоў за суцэльную калектывізацыю раёну ідуць **Замшанскі сельсавет,** які **калектывізаваны** на 10 красавіка **на 59,1 проц., Валынецкі** — на 45 проц. і **Кушлікаўскі**—44,9 проц.

Бясспрэчна, што **гэтага зруху партыйная арганізацыя дасягнула на аснове разгортваньня работы з беднатой.**

Ня гледзячы на рад дасягненьняў у справе калектывізацыі—усё-ж у некаторых сельсаветах і парт'ячэйках ня было вытрыманай партыйнай лініі. У **Замшанскім** сельсавеце **меў месца рад «лявацкіх» загібаў.**

Праваапартуністычная практыка зьяўла сабе гняздо ў радзе раённых арганізацый—райкаапсаюзе і райфінадзделе.

Райвыканком і райфінадздзел займаюцца патураньнем кулаку. Калі беднота і сераднякі раёну поўнасьцю выканалі свае падатковыя абавязацельствы перад дзяржавай, дык **кулак упарта сабатуе ўсе віды падаткаў.** Сельска-гаспадарны падатак кулакі і заможнікі ўнесьлі толькі на 59 проц., аднаразовы збор—на 24 проц. Цьвёрдыя заданьні па ўсіх відах загатовак кулацка-заможнай часткай выкананы толькі на 70 проц.

Паказаньня факты з усёй выразнасьцю сьведчаць аб неабходнасьці дэтальнай праверкі клясавай лініі работы райфінадзделу і рашучай чысткі ячэйкі ад практыкаў правага апартунізму.

Адсутнасьць на радзе вучасткаў вытрыманай партыйнай лініі давала і дае магчымасьць кулаку браць на буксір беднату і серадняцтва.

У радзе месц кулакі, якія праедзьлі ў калгасы, вялі агітацыю, каб пры абагульваньні маемасьці беднякі выплачвалі серадняком роўную долю за ўнесены апошнімі ў калгас інвэнтар. Кулакі імкнуцца ў новаарганізаваныя калгасы працягнуць думку, каб'збор насеньня для калгаснага пасеву праводзіўся ў адноль кавай долі як з бедняка, так і серадняка, раскладаючы агульную колькасьць калгаснай пахаці на ўсіх пароўні.

Ня ўсюды такая стаўка кулака, накіраваная на разрыў гаспадарчага калгаснага саюзу бедняка з серадняком, атрымлівала належны адпор.

Цьвёрдыя заданьні па пасеве даны 211 кулацка-заможным гаспадаркам, або 3,6 проц. усіх гаспадарак раёну.

Пасеўныя пляны да старых калгасаў поўнасьцю даведзены. Зараз ідзе складаньне плянаў веснавой сяўбы па калгасах, арганізаваных на прадагу апошніх 2-х дэкад.

Пляны веснавой сяўбы да двароў даводзяцца вельмі марудна. На 10 красавіка пляны даведзены да двароў толькі на 83,4 проц., прычым прырост за апошнюю дэкаду — 5,3 проц—невыстарчальны.

Аднаасобны сэктар у значнай частцы **выпаў з-пад увагі раённых арганізацый і ўстаноў.** Калі ў калгасах ачышчана насеньня на 96,6 проц., дык у аднаасобным сэктары толькі на 37,2 проц. У хвасьце нікчэмных тэмпаў ачысткі насеньня паўзуць **Галубоўскі** сельсавет, дзе аднаасобнікі ачысьцілі толькі 15 проц. насеньня, **Луначарскі**—24,1 проц. і **Дзіржавіцкі**—26,1 проц.

Становішча з засыпкай страхавых фондаў у аднаасобных гаспадарках пагражае. 37,2 проц—агульная колькасьць ссыпаных страхавых насенфондаў у аднаасобных гаспадарках раёну. Першая дэкада генэральнай праверкі дала рост з 33,5 проц. да 37,2 проц. на 10 красавіка, прычым паасобныя сельсаветы не ўзьнімаюцца вышэй 15 проц. выкананьня пляну.

Неабходна даць рашучы бой усякім спасылкам на аб'ектыўныя прычыны. Змог-жа Юзафоўскі сельсавет пры правільнай арганізацыі працы на 10 красавіка заданьне па засыпцы страхавых фондаў у аднаасобных гаспадарках выканаць на 94,1 проц.

Значна лепш стаіць справа з насеннымі фондамі па калгасах раёну. Фонды ў старых калгасах створаны на 120 проц., але паасобных відаў насеньня не хапае. На сёнешні дзень не хапае лубіну 20 цэнтнераў, сэрадэлі—8 цэнтн., капушыны—210, бульбы—400, рэпі—75.

Страхфонды арганізаваны ў калгасах на 82 проц., броньфуражныя фонды—на 38 калгасах.

Перад райпартарганізацыяй на ўсю пырыню зараз стаіць адказьнейшая задача па гаспадарчым умацаваньні і арганізаваным выхадзе ў поле, асабліва новых 36 калгасаў, арганізаваных на прадагу 2-х апошніх дэкад.

Тэмпы калектывізацыі павінны быць яшчэ больш павышаны. Ільнаводны Боркавіцкі раён павінен выйсьці на бальшавіцкую сяўбу ня менш як з 50 проц. аб'яднаных у калгасы бядняцка-серадняцкіх гаспадарак раёну.

А. Л.

Чарэйскі РВК—у баку ад бальшавіцкай вясны

Засядацельская мітусьня—замест практычнай работы

1200 гаспадарак не зямляўпарадкаваны

ЧАРЭЯ. Чарэйскі раён знаходзіцца ў радзе апошніх месц у справе падрыхтоўкі да другой бальшавіцкай вясны. Раённы выканаўчы камітэт яшчэ ня стаў на чале калгаснага руху, ня здолеў арганізаваць масы калгасьнікаў і беднякоў і сераднякоў—аднаасобнікаў для сустрэчы надыходзячай сяўбы.

Замест жывой практычнай работы РВК займаецца **засядацельскай мітусьнёй.** Нарады і пасяджэньні, якія працягваюцца па некалькі дзён, сталі сыстэмай у рабоце чарэйскага райвыканкому.

Райвыканком ня кіруе калектывізацыяй у раёне. Старшыня райвыканкому лічыць, што наогул калектывізацыя РВК не датычыць, гэтай справай навінен, на яго думку, займацца выключна райкалгассаюз. Нагаюцца факты, калі матар'ялы аб арганізацыі калгасаў па 3-4 тыдні валяюцца ў канцылярыі райвыканкому.

Пасеўныя пляны да аднаасобнікаў у большасьці вёсак яшчэ не даведзены. Сяляне ня ведаюць колькі і чаго ім трэба сеяць у гэтым годзе. Ня лепш і з зямляўпарадкаваньнем. **Дагэтуль яшчэ не зямляўпарадкавана звыш 1.200 аднаасобных гаспадарак.** У той-жа час у раёна ёсьць 6 каморнікаў, якія выехалі на работу толькі тыдзень таму назад, а дагэтуль сядзелі ў габіэтах і фактычна нічога не рабілі.

У радзе калгасаў раёну адчуваецца вельмі востры недахоп кармоў. Ня гледзячы на гэта, раённыя арганізацыі ня ўжылі ніякіх мер для мабілізацыі мясцовых кармавых рэсурсаў. **З кулацка-заможных гаспадарак яшчэ не апагнаны цьвёрдыя заданьні па сене.** Штодзенна кулакі і заможнікі вывозяць на рынак па 1.000 пуд. сена.

Набліжаюцца дні веснавой сяўбы. **Раённыя арганізацыі Чарэйшчыны павінны павярнуцца тварам да другой бальшавіцкай вясны, да разгортваньня калгаснага руху і дапамагчы калгасам, беднякам і сераднякам—аднаасобнікам пасьпяхова сустрэць і правесьці сяўбу.**

М.

Разагнаць кулацкі калгас!

Ва ўрочышчы **Арэхаўка,** Сеніцкага сельсавету (Менскі раён), у 1927 г. арганізаваўся калгас **«Свабода».** На чале калгасу аказаўся буйны гандляр **Астрахан.**

Гэты калгас увесь час займаецца спэкуляцыяй—скупляе у сялян пілят, кур, авечак і прадае іх у Менску на прыватным рынку. З гораду калгасьнікі прывозяць гарэлку і піва і распраюць іх сярод сялян.

Калгас мае 35 гэктараў зямлі, якую апрацоўвае пры дапамозе наёмнай рабочай сілы, самі калгасьнікі на зямлі не працуюць. Зараз, калі ўсе вакольныя вёскі ўступілі ў калектывы, калгас **«Свабода»** адмовіўся засяваць 5 гэктараў гароду, тлумачачы тым, што няма каму апрацоўваць.

Большую частку малака калгас прадае на прыватным рынку.

Пра ўсё гэтыя агітацыі ў калгасе ведаюць і сельсавет і парт'ячэйка, але ніякіх мер ня ўжываюць. За чатыры гады ў калгас ня ўступіла ні адна гаспадарка.

Сакратар ячэйкі КП(б)Б Качынскі заявіў, што пытаньнем аб калгасе павінны заняцца вышэйшыя органы. Гэтым ён імкнецца зьняць з сябе адказнасьць.

Трэба нарэшце разагнаць кулацкі калгас.

Скагінскі.

Папулярызацыя сельгаспадатку

дае новы прыліў

БАБРУЙСК. (наш кар.). У Малеевскім сельсавеце ў выніку распраюўкі новага закону аб падатку ў вёсцы Малеева ўступіла ў калгас 19 гаспадарак, у вёсцы Палянкі арганізаваўся новы калгас з 11 гаспадарак.

Забясьпечыць гаручым і маслам Мсьціслаўскую МТС!

МСЬЦІСЛАЎЛЬ. Арганізаваная ў раёне машына-трактарная станцыя сустракае сяўбу падрыхтаванай.

Раён дзейнасьці МТС разьбіты на 5 вытворчых вучасткаў. Тэхнічны пэрсанал—аграномы, мэханікі, старшыні рулявыя і г. д. ужо разьмеркаваны па вучастках і разьбіты на брыгады. Да кожнага трактара трымацаваны рулявыя, якія адказваюць за работу і спраўнасьць машыны. Складзены каляндарныя пляны работы брыгад. **Паводле плянаў сяўбу мяркуецца скончыць на працягу 24-25 дзён.**

Адзінай перашкодай у рабоце МТС зьяўляецца недахоп гаручага і масла. Пытаньне з забясьпячэньнем гаручым і маслам Мсьціслаўскай МТС ўскладняецца яшчэ тым, што яна знаходзіцца на адлегласьці 25 клм. ад чыгункі.

Нафтасьніцькат і Трактарацэнтр павінны ўжыць рашучыя меры, каб безадкладна забясьпечыць Мсьціслаўскую МТС гаручым і змазачным.

М.

Не хапае насеньня і кармоў

МСЬЦІСЛАЎЛЬ. На 10-га красавіка ў калгасах раёну былі аб'яднаны 32,5 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. **За другую дэкаду генэральнай праверкі ў раёне арганізавана 10 новых калгасаў. Зараз процант калектывізацыі ўжо дасягае каля 40.**

У раёне дзейнасьці МТС усе калгасы ўжо пераведзены на зьдзельшчыну, адчуваецца недахоп насеньня аўса, бульбы і траў. Не хапае таксама і кармоў.

Раённыя арганізацыі павінны зараз-жа прыняць усе захады да мабілізацыі мясцовых насенных і кармавых рэсурсаў, пераразьмеркаваць насеньне і кармы паміж калгасамі і распаўсюдзіць ўжываньне корму з тальля.

М.

344 новых калгасьнікаў—

у выніку абяцаваньня пастаноў VI зьезду саветаў

ШКЛОЎ.

У 30-ці **калгасах** на агульных сходах **калгасьнікаў і аднаасобнікаў былі шырока абмеркаваны пастановы VI зьезду саветаў аб калгасным будаўніцтве. У выніку за дакаду ў калгасы ўступіла 344 бядняцка-серадняцкія гаспадарні.**

Калгасы яшчэ не падрыхтаваліся як належыць да веснавой сяўбы. Насенныя фонды **створаны толькі ў разьмеры 87 проц., страхавыя — 64 проц. Ачышчана 78 проц. патрэбнага насеньня.**

У аднаасобным сэктары справа з падрыхтоўкай яшчэ горш.

М. Г.

Брыгада—асноўнае зьвяно

1.000 руб. на прэміяваньне ўдарнікай другой каласнай вясны

Калгасьнікі з калгасу **«Чырвоны партызан»,** Крычаўскага раёну з вялікім здавальненьнем сустрэлі пераход на зьдзельшчыну. Пытаньне аб зьдзельшчыне два разы разглядалася на пасяджэньні праўленьня, на вытворчай нарадзе. Вызначаныя нормы потым дэтальна абгаварваліся на агульным сходзе калгасьнікаў.

Усе працаздольныя калгасьнікі разьбіты на брыгады па ўзорваньні, баранаваньні, вываазцы гною, доглядзе жывёлы і адна камбінаваная брыгада.

Для пасьпяховага правядзеньня веснавой сяўбы створан спэцыяльны фонд у 1.000 руб. для прэміяваньня лепшых калгасьнікаў.

Калгас «Чырвоны партызан» выклікаў на сацыялістычнае спаборніцтва на лепшым правядзеньні сяўбы калгасы «Заветы Леніна» і «III Інтэрнацыянал».

Брыгада «Зьвязды»:

Д. АНЗТ, В. БУНТАР.

Зьдзельшчына

дапаможа ліквідаваць спажывецкія тэндэнцыі

Калгас імя **Дзяржынскага** (Менскі прыгарадны сельсавет) перайшоў на зьдзельшчыну. Калгасьнікі са здавальненьнем сустрэлі новую сыстэму арганізацыі працы. Калгас ліквідаваў абязьлічку. Да кожнага калгасьніка прымаваны конь, збруя і інвэнтар. Калгасьнікі разьбіты на брыгады па гарадзінстве, жывёлагадоўлі, вываазцы гною і г. д.

Нельга ня спыніцца на грубых памылках, якія былі дапушчаны ў калгасе пры разьмеркаваньні прыбытку мінулага году. Да апошняга часу ў калгасе панавалі спажывецкія тэндэнцыі. У выніку, у непадзельны фонд калгасу замест 5.886 руб. адлічылі толькі 1.771 руб. У фонд непрацаздольных было адлічана 4.285 руб., прычым, большая частка гэтых грошай была разьмеркавана па дзяцей. Прэміяльнага фонду ў калгасе зусім ня было складзена.

У калгасе наглядаецца яшчэ і такія выпадкі, калі пры выдачы кармоў на непабагуленую жывёлу не вядуць вялікага ўліку. Кармы выдаюцца дармова. Пры адлічэньнях у непадзельны капітал ня робіцца ніякай дыферэнцыяцыі — здзічаюць амаль з усіх гаспадарак па 25 проц. Толькі з 2-3 гаспадарак адлічылі па 50.

Усе гэтыя скажэньні пры разьмеркаваньні прыбытку былі дапушчаны з нарушэньні адсутнасьці кіраўніцтва з боку менскага райкаапсаюзу.

Зьдзельшчына павінна моцна ўдарыць па спажывецкіх тэндэнцыях і здаравіць вытворчасьць калгасу.

Брыгада «Зьвязды»:

ПАПКОЎ, ТАГУЛЕЎ, САПРЫНАЎ.

Кулак у калгасе

ВУЛА. (Наш. кар.).

Калгасы Глыбачанскага сельсавету былі больш за іншых засьмечаны кулакамі. Чыстка калгасаў ад клясавага ворага адразу дала новы прыліў. Так, калгас **«Ваяўнічы бязбожнік 1»,** выкінуўшы трох кулакоў, якія раней мелі па 120 дзесяцін зямлі, узрос з 17 да 50 гаспадарак.

Але гэты калгас аздароўлен толькі ў асноўным. **У ім яшчэ засталіся яўныя кулакі.** Напрыклад, кулацкі агент Чумакоў (выключан з партыі, зьнят з пасады старшыні сельсавету) **вядзе ў калгасе падрыўную работу. З ім у кампаніі—настаўнік Пыж,** выключаны з КАМ, самолу і прафсаюзу.

У калгас **прыняты яўна заможныя гаспадаркі,** напрыклад, **Шаршнёва Мікіты, які перад уступленьнем у калектыў усё разбазарыў,** або, напрыклад, **Касьцюшоў**—ён атрымаў цьвёрдае заданьне.

У калгасе стварыліся два лягеры: адзін з кулакоў і заможнікаў, на чале з Чумаковым і Пыжом, а **другі—антыкулацкі, дзе ўся бедната і сапраўдныя сераднякі.** Паміж абодвума лягерамі ідзе жорсткая клясавая барацьба. Яна праяўляецца ва ўсім, пачынаючы з адкрытых схватак, зрыву калгаснай работы і канчаючы ціхім нашэптваньнем (нацкоўваньнем) аднаго калгасьніка на другога. **Кулацка-заможніцкая група сьвядома вядзе калгас да разбурэньня, зрывае падрыхтоўку да сяўбы.**

Вось вышэй шкодніцкай дзейнасьці кулакоў і **старшыні калгасу — заможніка Мікіты Шаршнёва. Вытворчы плян ня складзен. Інвэнтар у беспарадку. Кармавыя фонды ня створаны. Калгасных коняй карміць няма чым, ня гледзячы на тое, што ў аднаасобнікаў, якія нядаўна ўступілі ў калгас, кармы ёсьць. Пры прыняцьці ў калгас, абагульвалі коняй, а абагульваньне кармоў праўленьне... адкладала да больш зручнага моманту.** Такую палітыку вядзе сам старшыня калгасу **Шаршнёў,** які, **здаўшы пару коняй, абагуліў толькі 20 пудоў сена.**

У калгасе **яшчэ не абагулена 9 коняй.** Шаршнёў тлумачыць гэта тым, што... «няма даговранасьці з Дарыстанцыяй аб перадачы калгасу ўзорнай абсталяванай стайні». Між тым, у калгасе ёсьць будынкі, якія могуць быць лёгка прыстасаваны пад стайні.

Замест абагуленьня коняй і ліквідацыі абязьлічкі, у калгасе **наглядаецца простае захаваньне ўласнасьці на каня.** Калгасьнік і зараз лічыць: **«конь мой».** Такой-жа думкі прытрымліваецца і сам старшыня калгасу.

Ня прымаючы ніякіх мер да абагуленьня фуражу, у калгасе **коняй кормяць насенным аўсом.** Некаторыя калгасьнікі якія маюць у індывідуальным карыстаньні кароў, кормяць іх капюшынай, прадаюць сена й капюшыну на рынку, у той час, калі абагуленая рабочая жывёла галадае.

Старшыня калгасу фактычна мае ў індывідуальным карыстаньні тры каровы. Калі беднякі заўважаюць на такое скрыўленьне дырэктывы аб абагуленьні жывёлы, дык заможныя ім адказваюць: «у мяне была гаспадарка, а ў цябе што?»

Ніякіх канкрэтных мер для правільнай арганізацыі працы на прынцыпах зьдзельшчыны ня прынята. Нядаўна калгасьніца-бяднячка Марозава падала заяву аб выхадзе з калгасу. Гэта было тым больш даўна, што Марозава ўдаўніца і ўзорная работніца. Але жаданьне гэтай калгасьніцы пакінуць калектыў стане зразумелым, калі прыняць пад увагу, што яе нагрузілі больш, чым чалавек можа выканаць. **У гэтым фаціе праяўляецца імкненьне кулакоў і заможнікаў больш цяжкую работу ўскласьці на бедняка.**

Заможніку Шаршнёву ня месца ў праўленьні і ў калгасе. Разам з ім неабходна выкарчаваць з калектыву ўсе рэшткі кулацтва. Толькі ачысьціўшы калектыў ад кулакоў, укараніўшы зьдзельшчыну, наладзіўшы работу з беднатой, калектыў **«Ваяўнічы бязбожнік 1»** даб'ецца новага магутнага прыліву і поўнага выкананьня другой бальшавіцкай вясны.

***

Наколькі некаторыя даволі адказныя раённыя работнікі дапамагаюць батрацка-бядняцкаму ядру змагацца з кулаком, яркі сьведчыць наступны малюнак пасяджэньня прэзыдыуму Вульскага РВК, не якім зацьвярджаліся справы па зямляўпарадкаваньні калгасаў. З вёсак **Іпава і Іпавец** прышло 9 сялян — былых батракоў, а цяпер беднякоў — са скаргамі, што **ім** іх адбіраюць зямлю і перадаюць яе калгасу, у які ўвайшлі кулакі і заможнікі.

На такія скаргі старшыня РВК тав. **Орсік** адказвае:

— Уступайце ў калгас і дапамагайце змагацца з кулакамі.

Нарада правільная. Але гэта яшчэ ня зна чыць, што трэба праходзіць міма сур'ёзных скаргаў беднякоў, што можа абмежавацца толькі парадай. Баранькаўскі сельсавет — асабліва сельсавет. Ён пераважна складаецца з польскага насельніцтва, дзе ўплыў ксяндза даволі моцны, дзе кулацтва і падкулачнікі, якія граюць тут значную ролю, ня зломлены.

Бяднячка Мар'я **Сіпко** гаворыць прэзыдыуму:

— **У калгас да кулакоў мы ня пойдзем. Досыць на кулакоў працавалі ранней** Крыўдна, што **зямлю адбіраюць не для беднякоў, а для кулакоў, якія схаваліся ў калгасе.** Мы самі згодны ісьці ў калгас і будзем у ім прыкладна працаваць, але ў такі, у якім няма кулакоў і заможнікаў...

— Канчайце, ня можам-жа мы сядзець дзень,—перабіў яе тав. Орсік.

З а **Кардон** прышлі дзьве жанчыны, якія выйшлі з калгасу, аб якім гаварыла Мар'я Сіпко. Гэтыя дзьве жанчыны просяць зямлі.

— Дадуць з запаснага фонду,—груба адказваюць ім, ня пытаючыся нават, чаму яны выйшлі з калгасу.

Былыя калгасьніцы самі імкн

Перад тварам адказных задач

Да вынікаў красавіцкага пленуму Менскага гаркому і гарКК КП(б)Б

Аб'яднаны красавіцкі пленум Менскага гаркому і гарКК КП(б)Б праводзіў свае работы ў перыяд, калі прамысловасьць пралетарская сталіцы БССР уступіла ў другі квартал трэцяга рашаючага году пяцігодкі, калі веснавая пасеўная кампанія ўступіла ў перыяд свайго практычнага праявленьня. Акрамі натуральна, гэта ўсё перад пленумам гаркому і гарКК паставіла задачу разам з іншымі пытаньнямі вырашыць 2 асноўныя: аб выкананьні прамфінпляну за першы квартал бягучага году і аб падрыхтоўцы да веснавой сяўбы і ходзе капектывізацыі.

Абмяркоўваючы першае пытаньне, пленум канстатаваў, што фабрыкі і заводы Менску прамфінпляну за першы квартал трэцяга году пяцігодкі ў значнай меры недавыканалі. Пераважная большасьць прадпрыемстваў у выкананьні квартальнага пляну мае рад прарываў. Гэта відаць хоць-бы з таго, што квартальныя заданьні па фабрыках і заводах расіну ў агульным выкананы толькі на 94,2 проц. На радзе прадпрыемстваў недапушчальнае становішча з выкананьнем і ўлікам якасных паказальнікаў выкананьня прамфінпляну. На такіх прадпрыемствах, як «Энергія», «Камунар», «Беларуска», абуковая фабрыка, друкарня імя Сталіна і інш., няма вестак, на якіх можна было-б меркаваць аб выкананьні задач па зьніжэньні сабекошту. Працоўная дысцыпліна на радзе фабрык і заводаў яшчэ не настаўлена на тую вышыню, на якой яна павінна стаяць. Напрыклад, на заводзе «Дрэзаарацоўшчык», на ф-цы імя Я сакавіка, на гуце, першы квартал бягучага году даў значнае павышэньне прагулаў у параўнаньні з апошнімі кварталамі мінулага году і асобнага кварталу.

Вышэйпалажэнае становішча зьяўляецца толькі ў рэзультаце таго, што партыйныя калектывы да тэтага часу не дабіліся канкрэтызацыі партыйнага кіраўніцтва вытворчасьцю, не сканцэнтралі ўвагі лідавых партыйных зьяўленняў на пытаньнях, якія адыгрываюць рашаючае значэньне ў выкананьні прамфінпляну (цэхавае і міжцэхавае пляніраваньне, снаб, рабочая сіла, увядзеньне шматзменнасьці і г. д.). Партыйныя ячэйкі вельмі марудна перабудоўваюць сваю работу, не пераносяць цэнтру цяжару партработы ў лізавое вытворчае зьвяно, не пераключыліся на выкананьне пастановы ЦК УсеКП(б) аб рабоце ў цэху і брыгадзе.

Адной з галоўнейшых перашкод у выкананьні прамфінпляну зьяўляецца і тое, што партыйныя, прафсаюзныя і адміністрацыйныя органы вялі слабае змаганьне за перавод цэхаў на гаспадарчы разрахунак, за аўладаньне тэхнікай, за скарыстаньне ўсіх унутраных рэсурсаў. Рад парт'ячэек слаба кіравалі разгортваньнем сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, невыстарчальна змагаліся за новыя кадры ўдарнікаў. Некаторыя ячэйкі навет не прапрацавалі зькліку рабочых тульскага заводу, не скарысталі іх адозвы для пырэйшага разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва, для ўздыму яго на вышэйшую ступень.

Пленум гаркому і гарКК паставіў перад усімі партыйнымі ячэйкамі фабрык і заводаў і перад усёй арганізацыяй у цэлым задачу — **«дабіцца неадкладнага рашучага пералому ў кіраўніцтве прамысловасьцю. Забясьпечыць бязумоўнае пакрыцьцё запазычанасьці за першы квартал выкананьнем і перавыкананьнем пляну другога кварталу трэцяга рашаючага году пяцігодкі».** Ажыцьцяўленьне гэтай задачы патрабуе ад партыйных арганізацый бязьлітаснага змаганьня з праяўленьнямі правага апартунізму, з момантамі непаяротлівасьці гаспадарчых і прафсаюзных арганізацый, з усякімі фактамі перашучасьці і нівыразнасьці ў барацьбе за бязьвую пратраму бягучага году. На тых прадпрыемствах, дзе не закончана перабудова партработы, партканкрэты павінны не неадкладна правесьці. Прычым гэта перабудова павінна суправаджацца клыбокай праверкай выкананьня як пырэйшага ў вышэйшых партортанаў, так і сваіх уласных пастаноў.

Пераводу цэхаў на гаспадарчы разрахунак павінен быць пазаны бальвы характар. Партыйныя ячэйкі зараз-жа павінны правярыць ход работы па пераводзе цэхаў на гаспадарчы разрахунак і забясьпечыць поўнае выкананьне партыйных дырэктыў.

У свайй пастанове пленум з асаблівай сілай падкрэсьліў неабходнасьць пырэйшага разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Пленум абвясьціў месячнік агульду становішча спаборніцтва і ўдарніцтва, які павінен быць скарыстаны для ліквідацыі прарываў у выкананьні прамфінпляну, для ўздыму новай хвалі актыўнасьці рабочых мас, для выкрыцьця ідэя-ўдарнікаў і вярбоўкі ва ўдарніцкія рады новых сотень і тысяч рабочых.

Калектывізацыя сельскай гаспадаркі раёну за апошні пэрыяд значна апярэдзіла. Бядняцка - серадняцкія гаспадаркі раёну калектывізаваны на 41,3 процантаў. Есьць сельсаветы, дзе калектывізацыя дасягнула 70% (Астрашыцка - Гарадзецкі, Ратамскі). Аднак, разам з такімі ёсьць яшчэ сельсаветы, дзе калектывізацыя бядняцка - серадняцкіх гаспадарак не перавышае 9—12 процантаў. (Лагойскім, Каралінчанскім, Новадворскім і Бараўскім). Такое адставаньне раду сельсаветаў ставіць пад пагрозу выкананьне задачы, якая пастаўлена лютаўскім пленумам гаркому аб тым, што 60 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак да часу веснавой сяўбы павінны быць ахоплены калгасамі. Такі нізкі процант калектывізацыі раёну — рэзультат таго, што асобныя парт'ячэйкі і сельсаветы не паставілі па-баявому работы па мабілізацыі бядняцка - серадняцкіх мас вакол задач партыі. Рад парт'ячэек не разгарнулі масавай работы вакол задач калгаснага руху. У радзе паасобных парт'ячэек яшчэ і да тэтага часу пануе правазапартуністычная практыка, стаўка на самацёк. Важнейшыя гаспадарчапалітычныя кампаніі, якія праводзіліся партыяй па вёсцы, у радзе месц ня ўвазаліся з задачамі калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Ня гледячы на тое, што да палявых работ застаўся вольмі кароткі пэрыяд, рад мерапрыемстваў, якія пакіраваны на забясьпечыньне посьпехаў другой бальшавіцкай вясны, на раёне праведзены не ў выстарчальнай ступені. Каля 15 проц. агульнага ліку калгасаў да часу работ пленуму ня мелі выторчых плянаў. Пераарганізаваныя калгасы ня склалі плянаў пасеўнай кампаніі. У гэтых калгасах вельмі марудна праходзіць агрэмажданьне маемасьці: сродкаў вытворчасьці, цягавай сілы і таварна - прадукцыйнай жывёлы.

Рад сельсаветаў — Гатаўскі, Грычанскі, Падгайскі — апартуністычна адносяцца да задачы давядзеньня плянаў да пасобных двароў. У гэтых сельсаветах ня даны цьвёрдыя заданьні па пасеве кулацкім і заможным гаспадаркам.

Кантрактацыя па ўсіх відах культур па калгасах раёну праводзіцца зусім невыстарчальна і яшчэ горш па аднаасобным сэктары. Плян кантрактацыі па калгасах выкананы толькі на 68 процантаў, а па аднаасобным сэктары —на 66,5 проц. Гэта лічба—выразны паказьнік таго, што рад сельсаветаў і партыйных ячэек фармальна, бюракратычна падыйшлі да ажыцьцяўленьня важнейшага мерапрыемства партыі.

У радзе сельсаветаў намядаецца адставаньне і ў справе стварэньня насенных і страхавых фондаў, па абмене насеньня на гатункове, па падрыхтоўцы да палявых работ цягавай сілы, па стварэньні фуражных фондаў і інш.

Пленум, канстатуючы ўсе гэтыя моманты, вынес рад канкрэтных прананоў, накіраваных на забясьпечэньне посьпехаў у правядзеньні другой бальшавіцкай вясны, у ажыцьцяўленьні пастаноў VI Усесаюзнага зьезду саветаў. Той кароткі пэрыяд, які застаўся да пачатку палявых работ, кожная парт'ячэйка і кожны сельсавет павінны скарыстаць для ліквідацыі ўсіх тых прарываў, якія мелі месца ў падрыхтоўцы да сяўбы.

Асобна пленум падкрэсьліў неабходнасьць фарсаваных тэмпаў у рабоце па падрыхтоўцы да сяўбы ў прыгарадных гаспадарках. Пленум прапанаваў адпаведным арганізацыям забясьпечыць прыгарадныя гаспадаркі МІРК рабочай сілай, насеньнем раньняй бульбы, гародніх культур і неабходнымі сродкамі вытворчасьці. Усе сілы партыйных ячэек, усе наяўныя рэсурсы, павінны быць кінуты на пасьпяховае правядзеньне палявых работ, на поўнае выкананьне пляну веснавой сяўбы.

У сьвятле ўсіх гэтых задач вельмі востра паўстае пытаньне **аб павышэньні кіруючай ролі саветаў у змаганьні за генэральную лінію партыі і аб перабудове іх масавай работы.** Таму разам з вышэйпамянёнымі пытаньнямі пленум абмеркаваў і гэтае пытаньне, якое адыгрывае рашаючае значэньне ў выкананьні задач, якія пастаўлены перад прамысловасьцю ў трэцім годзе пяцігодкі, у правядзеньні сацэльнай калектывізацыі і па яе аснове ліквідацыі кулацтва як класы. Пленум канстатаваў, што «сучаснае становішча масавай работы саветаў знаходзіцца далёка не ў здавальняючым становішчы» і вызначыў канкрэтныя мерапрыемствы, накіраваныя на перабудову масавай работы, мерапрыемствы, якія забясьпечваюць павышэньне кіруючай ролі саветаў у змаганьні за ажыцьцяўленьне лёзунгу: «Пяцігодка — за чатыры гады». Пленум даў канкрэтныя ўказаньні фракцыям саветаў аб разгортваньні работы дэпутацкіх груп, сэкцый саветаў як у горадзе, так і на вёсцы, аб уцягненьні ў іх работу шырокіх мас рабочых, калгаснікаў, беднаты і серадняцкой.

Партыйныя ячэйкі павінны пераключыцца на выкананьне гэтай важнейшай пастановы пленуму і ў сваёй штодзённай рабоце дабівацца, каб органы пралетарскай дыктатуры і ў горадзе і па вёсцы праводзілі сваю работу ў адпаведнасьці з тэмпамі рэканструкцыйнага пэрыяду.

Па меры разгортваньня індустрыялізацыі краіны, па меры разгортваньня калектывізацыі сельскай гаспадаркі ўсё больш і больш павышаецца дабрабыт шырокіх пралетарскіх і працоўных мас. Аднак, становішча камунальнай гаспадаркі яшчэ не забясьпечвае тых патрэб, якія прад'яўляюцца ростам пралетарыяту, ростам сацыялістычнага сэктару народнай гаспадаркі. Камунальная гаспадарка патрабуе свайго паляпшэньня. Таму пленум гаркому і гарКК асобна абмеркаваў пытаньне аб становішчы камунальнай гаспадаркі Менску. Свай пастановай пленум вызначыў рад аб'ектаў кватэрнага будаўніцтва і бытавых устаноў, вызначыў канкрэтныя мерапрыемствы ў паляпшэньні зносін з рабочымі кварталамі.

Выкананьне ўсіх вызначаных пленумам задач патрабуе ад усёй Менскай гарпартарганізацыі і ад кожнай партыйнай ячэйкі ў паасобку бальшавіцкіх тэмпаў работы, бязьлітаснага змаганьня з усякімі скажэньнямі партыйнай лініі. Менская партарганізацыя — адзін з буйнейшых і перадавых пралетарскіх атрадаў КП(б)Б — гэтыя задачы з гонарам выканае. Зарука гэтаму — бальшавіцкае адзінства і маналітнасьць Менскай партарганізацыі.

З БАЛЬШАВІЦКАЙ НАСТОЙЛІВАСЬЦЮ АЖЫЦЬЦЯЎЛЯЦЬ ЛЕНІНСКУЮ НАЦПАЛІТЫКУ

Заўзяты вялікадзяржаўны шавініст Вігонны ўступае ў пераклічку з Чудзіным

Выганім з нашых радоў чудзінаўцаў, яшчэ больш мабілізуем свае сілы на ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі—так заяўляюць масы працоўнай інтэлігенцыі, настаўніцтва і вучнёўскай моладзі

Агонь па канкрэтных посьбітах— вялікадзяржаўнага расійскага шавінізму

У сваёй пастанове «аб нацыянальным пытаньні» Кастрычніцкі пленум ЦК КП(б)Б падкрэсьліў, што «вялікадзяржаўны шавінізм знаходзіць сваё выяўленьне ў адмаўленьні беларускай нацыі, у адмаўленьні беларускай мовы, у пагардлівых адносінах да мовы, у актыўным і пасыўным супраціўленьні справе беларусізацыі». Тэта абсалютна вернае палажэньне, высунутае пленумам ЦК, за апошнія 6 месяцаў, якія прайшлі з часу работ пленуму, пацьвердзілася цалкам і поўнасьцю.

КП(б)Б над кіраўніцтвам свайго ЦК, пяхўхільна ажыцьцяўляючы ленінскую нацпалітыку, наносячы руйнуючы ўдар па ўсякіх скажэньнях лініі партыі ў нацпытаньні, за апошні пэрыяд спаткалася з радам фактаў праяў вялікадзяржаўнага шавінізму (вылазка «настаўніцы» Гуло, чудзінчына і інш.). Усе гэтыя вылазкі адбываліся імённа пад сьцягам адмаўленьня беларускай нацыі, пад знакам шалёнага супраціўленьня ажыцьцяўленьню ленінскай нацыянальнай палітыкі і яе суставой часткі—беларусізацыі. Партыя, пад яе кіраўніцтвам і ўся пралетарская грамадзкасьць, асноўныя масы інтэлігенцыі далі рашучы адпор вылазкам разьюшаных вялікадзяржаўных шавіністаў.

Мы сёньня зьмяшчаем рэзалюцыі сходу настаўнікаў і выкладчыкаў адносна вылазкі Чудзіна, гэтага агента клясава-варожых элементаў, які праліз у рады асьветчыкаў. Чырвонасьцяжнае настаўніцтва БССР глыбока абурана вылазкай Чудзіна і патрабуе выкінуць яго за борт сацыялістычнага будаўніцтва, як ворага палітыкі партыі, як ворага пралетарскай дыктатуры. І гэта патрабаваньне зусім натуральнае і законнае. Асноўныя масы настаўніцтва і працоўнай інтэлігенцыі наогул, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, прымаюць актыўны ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве, пакіроўваюць усе свае сілы, усю энэргію на ажыцьцяўленьне лёзунгу «Пяцігодка—за чатыры гады». Усякія-ж Чудзіны і ім падобнае ахвосьце чорнасоценчыны, турботнікі кулацкіх інтарэсаў імкнуцца падарваць сацыялістычнае будаўніцтва.

Настаўніцтва і ўся працоўная інтэлігенцыя БССР голасам абурэньня супроць чудзінчыны заяўляе, што прыкладзе ўсе сілы да справы ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі і ўпэўняе партыю, што праявіць яшчэ больш пільнасьці ў змаганьні супроць усякага роду праяў вялікадзяржаўнага шавінізму, контр-рэвалюцыйнага беларускага нацыянал-дэмакратызму і шавінізмаў іншых колераў. Тым больш, што Чудзін не адзінкавы. Чудзіны прытаіліся і ў радах інтэлігенцыі і нават пралезьлі ў рады пралетарыяту. Яны чакаюць зручнага моманту, каб атакаваць палітыку партыі, каб зрабіць сваю чарговую атэдыаду вылазку супроць пераможнага сацыялістычнага наступленьня на ўсім фронце.

Ніжэй мы зьмяшчаем допіс аб тым, што прараб 8-га вучастку Белкалгасбуду—Вігонны дэманстрацыйна адмовіўся чытаць атрыманую адносіну на беларускай мове. Пралетарская грамадзкасьць 8-га вучастку павінна неадкладна рэагаваць на гэту вылазку вялікадзяржаўнага шавініста Вігоннага.

Вялікадзяржаўны шавінізм—галоўная небясьпека на даным этапе. Гэта ня формула, а зусім бясспрэчнае, праверанае палажэньне. Яго павінен памятаць кожны член партыі, кожны рабочы і калгаснік, кожны інтэлігент, які самааддана змагаецца за перамогу сацыялізму. Выкрываючы канкрэтныя посьбітаў вялікадзяржаўнага шавінізму, разгортваючы беларусізацыю, умацоўваючы пралетарскае кіраўніцтва разьвіцьцём нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьмесьце пралетарскай культуры,—КП(б)Б будзе няўхільна ажыцьцяўляць ленінскую нацыянальную палітыку. У баёх супроць вялікадзяржаўнага расійскага шавінізму—галоўнай небясьпекі на даным этапе—супроць контр-рэвалюцыйнага беларускага нацыянал-дэмакратызму і шавінізмаў усіх колераў партыя дабіецца новых посьпехаў у культурна-нацыянальным будаўніцтве БССР.

Дэкларацыя клясавай нянавісьці

(З пастановы агульнага сходу студэнтаў, выкладчыкаў супрацоўнікаў рабочага факультэту БДУ)

Клясавы вораг — чэпман, кулак, пікоднік — імкнецца перашкодзіць магутнаму руху сацыялістычнага будаўніцтва па ўсіх яго галінах. У сувязі з гэтым на ўсіх яго галінах. У сувязі з гэтым на ўсіх яго галінах. У сувязі з гэтым на

ПРАВЕСЬЦІ БАЯВУЮ ПРАВЕРКУ

ПАДРЫХТАВАНАСЬЦІ ДА СПЛАВУ

ПАДРЫХТОЎКУ РАБОЧАЙ І ТЭХНІЧНАЙ БАЗЫ СПЛАВУ—ПАД КАНТРОЛЬ ГРАМАДЗКАСЬЦІ

Саюзлеспрам абвясьціў вымову Лесбелу за дрэнную работу па сплаве

„Зьвязда" ўключаецца ў дэкаду праверкі

«Правда» абвясьціла дзесяцідзеньнік праверкі падрыхтоўкі да сплаву. Дзесяцідзеньнік мае мэтай падцягнуць адсталыя вучасткі, у баявым парадку праверыць гатоўнасьць сплаўных вучасткаў да надыходзячай кампаніі.

Усе арганізацыі БССР павінны ўключыцца ў дэкаду праверкі і мабілізаваць грамадзкасьць вакол пытаньняў сплаву.

«Зьвязда», уключаючыся ў дзесяцідзеньнік, разгортвае баявы агляд падрыхтаванасьці да сплаву. Адпаводныя заданьні даны карэспандэнцкай сетцы газэты.

ПАВОДКА НА СПЛАВЕ

Недапусьціць расплыву лесу

Сплаўны ўчастак Лесбелу атрымаў рад тэлеграм аб паводцы на лесасплаве.

Паводле даных на 25-га красавіка, паводка пагражае базе Бабруйскаму камбінату; расплылася частка драўніны, выстаўлены пасты, каб затрымаць яе. Рабочыя брыгады ўвесь час працуюць па ўтрыманьні базы. Сельсаветы дапамагаюць умацаваньню сплаўных прыстаней.

Паводле тэлеграмы з Барысава, лёд на Бярэзіне прайшоў, прыстані ўмацаваны. Былі выпадкі дробнага расплыву драўніны. Мабілізавана прыбярэжнае насельніцтва.

На рэках **Усе** і **Ушы** вада пачала зьмяншацца.

З прыстані Лоўка ўшесла 100 раўмэтраў дроў. З прыстані Спуя ўплыла 2 тыс. кубаметр. шаматар'ялаў, але лес затрыманы ў Дубініках.

На прыстані Чагарынка на р. **Друць** зьнесена 2.500 раўмэтраў дроў і 700 кбм. страчанага лесу. Дана тэлеграма Рагачоўскаму лесапрамгасу і Бабруйскай сплаўной канторы арганізаваць пункты для перахвату драўніны.

Пад'ём вады на р. **Нёмане** прыпыніўся. Пагроза мінула. Лесаматар'ял па прыстані ачуцьцяліі.

Паводле тэлеграмы з Гомелю, уплыўшы з Сожы заводу «Калпраца» лес затрыманы.

Катер «Уздыхмор» і маторная лодка дапамагаюць затрыманьню зьнесеных лесаматар'ялаў.

ШЭНКМАН.

Бярэце прыклад з Кашанскага сельсавету

КРЫЧАЎ. (НАШ КАР.). БЕДНЯКІ І СЕРАДНЯКІ ВЁСКІ ЛАБКОВІЧЫ, КАШАНСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ, ВЫВЕЗЬЛІ 200 КБМ. ПЕСАМАТАР'ЯЛАЎ — ШПАЛ ДЛЯ ФАСФАРЫТНАГА ЗАВОДУ І ДАСТАВІЛІ ІХ НА ЛЕСАПЫЛЬНЮ.

НА ГРОШЫ, ЯКІЯ ІМ НАЛЕЖАЛІ, У СУМЕ 750 РУБ. ЯНЫ НАБЫЛІ АБЛІГАЦЫІ ПАЗЫКІ «ПЯЦІГОДКА ЗА ЧАТЫРЫ ГАДЫ» І ВЫКЛІКАЛІ СУСЕДНІ БЯЛЬСКІ СЕЛЬСАВЕТ.

ІЛОГУЛ, КАШАНСКІ СЕЛЬСАВЕТ ВЫКАНАЎ 98 ПРОЦ. ЗАДАНЬНЯ ПА ВЫВАЗЦЫ ЛЯСУ.

В. Б. і Д. А.

Са „сьляпым" плянам працаваць нельга

За недапушчальнае ігнараваньне дырэктыў Саюзлеспраму і за нядбалае плянаваньне сплаву і водных перавозак, старшыня Саюзлеспраму тав. Бергавінаў абвясьціў вымову б. старшыні праўленьня Лесбелу тав. Амбражуласу.

— Паўтараньне такіх выпадкаў—адзначана ў загадзе,—пагражае за сабою спыненьне фінансаваньня «сьляпога» пляну і зьніцьце вінаватых з работы і адданьне пад суд.

У загадзе падкрэсьлена, што кіраўнікі трэстаў павінны зразумець, што немагчыма выканаць важнейшую для краіны гаспадарчую задачу, без выразнай аперацыйнай работы, суровай дысцыпліны з боку кожнага работніка.

Барысаўскі леспрамгас не падрыхтаваны да сплаву

Выкананьне баявога заданьня—пад пагрозай

БАРЫСАЎ. (Па тэлефону). Ня гледзячы на тое, што ўжо пашоў лёд і пачалася паводка, Барысаўскі леспрамгас не падрыхтаваны да сплаву. Дагэтуль пляны сплаву не даведзены да вучасткаў і сельсаветаў. Не падрыхтаваны кацеры і маторныя лодкі, якары і іншая снасьць. На сплаўных падвучастках няма кантрольных пічбаў сплаву.

Цяжкое становішча з вярбоўкай плытагонаў — патрэбны 1.500 чал., ёсьць толькі 700.

Для сплаву па р. Сха патрэбны 500 плытагонаў, дагэтуль няма ніводнага.

Плешчаніцкі, Барысаўскі і Лагойскі райвыканкомы ня ўжываюць патрэбных мер для забесьпячэньня сплаву рабочай сілай.

Барысаўскі леспрамгас вывез да сплаўных прыстаней 37 проц. загатоўленага лесу і 67 проц. дроў.

Сплаўныя вучасткі не забясьпечаны таварамі. Патрэбны 1.500 пар ботаў, ёсьць усяго 500. Каапэрацыйныя крамы на вучастках не арганізаваны. Рабочым плытагонаў да гэтага часу ня створан. Сплаў не забясьпечан тэхнічным пэрсаналам.

Барысаўскі вучастак павінен сплавіць 500 тыс. кбм. песаматар'ялаў. Дрэннае становішча з падрыхтоўкай пагражае выкананьню баявога заданьня.

У адказ на плёткі буржуазіі

На зьлеце ўдарнікаў-лесарубаў

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). У Магілеве адбыўся зьлёт ударнікаў-лесарубаў і возчыкаў Магілеўскага лесапрамгасу. На зьлёце разгарнулася сацспаборніцтва асобных арцеляй: Навасёлкаўская арцель выклікала Чамерынскую, Шклоўская — Лупалаўскую. Удзельнікі зьлёту замацавалі сябе на працу да поўнага выкананьня пляну лесазагатовак.

У адказ на плёткі буржуазіі аб прымусовай працы на лесазагатоўках СССР, лесарубы і возчыкі абвясьцілі сябе ўдарнікамі імя «518» і «1040», далучыліся да ініцыятывы тульскіх рабочых і ўзялі на сябе абавязак — шырока разгарнуць растлумачэньне адозвы сярод бядняцка-серадняцкіх мас вёскі; арганізаваць ударныя арцелі і брыгады, узьняўшы прадукцыйнасьць працы да 10 кбм. за 8 гадз.

Зьлёт прызнаў, што **плян загатовак і вывазкі лесу зусім рэальны і павінен быць перавыкананы.**

З пунктаў сплаву паведамляюць

МАЗЫР. (Наш кар.). На прыстані, у **Сухавіцкім** сельсавеце загатоўлена 4.700 кбм. лесу. Ня гледзячы на тое, што рака пайшла, дагэтуль ня прыступлена да вязкі плытоў. Не хапае рабочай сілы. Калі ня будуць прыняты рашучыя меры, лес ня будзе сплаўлен.

***

КРЫЧАЎ. (Наш кар.). Злачынна павольна ідзе падрыхтоўка да сплаву па Крычаўскай сплаўной канторы. Завербавана 118 плытагонаў, патрэбны для першай чаргі сплаву 490 чал.

Дырэктыва Белкалгасцэнтру Крычаўскаму райкалгассаюзу — паслаць на сплаў 50 калгаснікаў — ня выканана. Чэрыкаўскі райкалгассаюз, які павінен быў даць 200 плытагонаў, нічога не зрабіў.

Вельмі дрэнна ідзе загатоўка гужбы. Крычаўскі леспрамгас павінен быў загатовіць 75 тыс. пар гужбы; дагэтуль загатоўлена 30 тыс. Чэрыкаўскі леспрамгас, які павінен быў загатовіць 600 тыс. пар гужбы, выканаў сваё заданьне на 30 проц.

Трэба адзначыць, што апарат сплаўной канторы засьмечан чужым элементам. Галоўны загатоўца канторы — **Гурэвіч** — былы Крычаўскі спекулянт.

Раёнцы арганізацыі мала цікавяцца сплавам.

Фонкац.

Выратаваць увесь зьнесены лес

Умацаваць сплаўныя прыстані

Паводле тэлеграфнага данясеньня Чэрвеньскага леспрамгасу, уздым вады на р. ВОЛМЕ прыпыніўся, прыстані ўмацаваны.

На р. УШЫ сарваныя 3 тысячы кбм. драўніны затрыманы і ўмацаваны на мясцох. На р. УСЬЦЕ зьнесла млыны «Пруд» і «Новая ніва». Сплаўныя прыстані ўтрыманы.

На р. СХА вада пачынае спадаць. Прыстаням небясьпека не пагражае.

Распыліся лесаматар'ялы на р. БРУСЯЦЫ. Прыняты тэрміновыя меры да іх затрыманьня. На прыстані Багушэвічы сарвана 100 кбм. песаматар'ялу. Вада зьмяншаецца.

На р. ОЛЬСЕ ўсе прыстані падняты, але ўмацаваны. Выстаўлены арцелі для поўлі зьнесенага лесу. У рабоце прымаюць удзел сельсаветы.

На р. р. Уэльдзяницы, Лошы, Нёмане вада спадае. Прыстані ўзмоцнены, пагрозы няма.

РАКА СОЖ

У Гомелі з базы заводу «Каппраца» сарвана 6 месц лесаматар'ялу. Высланы параходы для поўлі зьнесенага лесу. Прыстань Бабічы зрушана на ½ клм., але затрымана. Сплаўная кантора спусьціла адзін катэр для аказаньня дапамогі. Уздым вады вельмі вялікі.

Паводле тэлеграмы з Полацку, на Зах. Дзьвіне нябывалы ўздым вады. Румы ўзмоцнены. Установлены дзяжурствы на працягу сутак. Мабілізуецца насельніцтва.

Падтрымаць ініцыятыву перадавых ударнікаў

Крэдытную рэформу і гаспадарчы разрахунак—

У ЦЭХ, У БРЫГАДУ

Пастанова УсеЦСПС

Лічачы зусім недапушчальнымі адносіны ЦК саюзаў, у асаблівасьці ЦК мэтапоргіі, вугалю, будаўнікоў, воднікаў, да выкананьня важнейшых дырэктыў партыі і ўраду аб новых умовах крэдытаваньня і гаспадарчага разьліку, маючых выключнае гаспадарча-палітычнае значэньне, прэзыдыум УсеЦСПС прапануе:

I.

ЦК саюзаў і ЦСПС у трохзвенным тэрміне праверыць прычыны зацяжкі многімі гаспадарчымі органамі заключэньня дагавароў і генеральных згод і дабіцца заключэньня іх у дакладна ўстаноўленым ўрадам тэрміне, аказаўшы гаспадарнікам неабходную дапамогу ў гэтай справе. Заўкомам і вытворчым нарадам неадкладна ўзяць пад кантроль заключэньне дагавароў паміж прадпрыемствамі, дабіваючыся бязгаваротнага выкананьня дырэктыў аб крэдытнай рэформе і гаспадарчым разрахунку. Для аказаньня дапамогі заўкомам у гэтай рабоце ЦК саюзаў і ЦСПС камандыраваць на асноўныя прадпрыемствы кіруючых работнікаў.

II.

Фабзаўкомам з 25 красавіка па 1 мая правесьці на ўсіх прадпрыемствах агульна-заводзкія вытворчыя канфэрэнцыі рабочых, на якіх абмеркаваць даклады дырэктарсу аб выкананьні на даным прадпрыемстве дырэктыў ураду па крэдытнай рэформе і гаспадарчым разрахунку і вынікаючых адгэтуль канкрэтных мерапрыемстваў.

III.

Саюзным арганізацыям разгарнуць на вытворчых нарадах цэху, зменны і груп прапрацоўку дагавароў, якія заключаюцца, і абавязацельстваў, што вынікаюць з іх, **забясьпечыўшы супольна з гаспадарчымі органамі давядзеньне гэтых абавязацельстваў да брыгад і паасобных рабочых. Паміж прадпрыемствамі і цэхамі разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва на лепшае выкананьне канкрэтных абавязацельстваў дагавароў** (тэрміны даставкі, якасьць, асартымэнт, сабекошт і г. д.). **Саюзным арганізацыям падтрымаць ініцыятыву перадавых ударнікаў па ўцягненьні ўдарных брыгад у работу па пераводзе на гаспадарчы разьлік прадпрыемстваў і цэхаў у мэтах забесьпячэньня рэалізацыі сустрэчнага прамфінпляну і максымальнай эканоміі ў выдаткаваньні матар'ялаў, энэргіі, абсталяваньня, рабсілы і паляпшэньня якасьці выпускаемай прадукцыі.** У сувязі з гэтым УсеЦСПС прапануе ўсім прафсаюзным арганізацыям правесьці шырокае растлумачэньне пастановы ўраду і задач гаспадарчага разрахунку.

IV.

Правядзеньне крэдытнай рэформы і гаспадарчага разрахунку павінна быць максымальна выкарыстана прафсаюзнымі арганізацыямі для шырокай мабілізацыі рабочых на барацьбу за ўмацаваньне працоўнай дысцыпліны, за мабілізацыю ўсіх унутраных рэсурсаў у мэтах хутчэйшай ліквідацыі прарываў, якія ставяцца ў выкананьні прамфінпляну. Ды гэтым асаблівую ўвагу трэба аддаць выкананьню фінансавага пляну прадпрыемства, у сувязі з чым пытаньні цаны, сабекошту, выдаткавальня крэдытных асигнаваньняў, фінансавай гаспадаркі прадпрыемства і цэху павінны стаць прадметам сыстэматычнага кантролю з боку вытворчых нарад і заводзкіх арганізацый.

V.

Саюзу фінансава-банкаўскіх работнікаў супольна з Дзяржбанкам перабудаваць работу фінансавага апарату і тэхніку разрахунку з тым, каб на аснове выразнага правядзеньня дырэктыў ураду аб крэдытнай рэформе забясьпечыць актыўную ролю фінансавага апарату ў справе сваячасовага дапамажаньня і мабілізацыі ўвагі прафсаюзаў да эканамічнага і фінансавага становішча прадпрыемства і аб'яднаньня.

Прафсаюзным арганізацыям устанавіць сыстэматычны кантроль за выкананьнем гаспадарчымі органамі ўсіх фінансавых абавязацельстваў, у тым ліку за сваячасовай выплатай заработнай платы рабочым.

Гульня ў гаспадарчы разрахунак

НА ЗАВОДЗЕ „ДРЭВААПРАЦОЎШЧЫК"

Дагаворная кампанія і пераход цэхаў на гаспадарчы разрахунак на заводзе «Дрэваапрацоўшчык» праходзіць вельмі дрэнна. Да 20-га красавіка ня былі заключаны дагаворы з Менскім і Неманскім леспрамгасамі па дастаўцы лесаматар'ялу, не заключаны лёкальныя ўмовы з Белдзяржснабам на дастаўку прамтавараў. На збыце канцылярскай мэблі павінен быць заключан дагавор з Менскім аддзяленьнем Аргбуду. 17-га красавіка кіраўнік аддзяленьня Аргбуду падпісаў дагавор, **але заводакіраўніцтва чакае атрыманьня генэральнага дагавору з цэнтральным праўленьнем Аргбуду.** Да 20-га красавіка канчаткова ня ўзгоднен з Лесбелам нарад-заказ на водпуск лесаматар'ялаў заенняму ведамству.

Грамадзкасьць заводу ня прымала ўдзелу у пераводзе цэхаў заводу на гаспадарчы разрахунак. **Прафарганізацыя гэтым пытаньнем ня цікавілася.** Чарговы цэмар шматтыражкі за 17-га красавіка ніводным словам не зазначыў пытаньня аб пераводзе цэхаў на гаспадарчы разрахунак.

З усіх цэхаў заводу на гаспадарчы разрахунак пераведзены толькі тры: мэханічны, зборачны і аддзелачны. Умовы паміж заводакіраўніцтвам і адміністрацыяй цэхаў падпісаны 8-12 красавіка **толькі на адзін месяц.** Да моманту пераходу цэхаў на гаспадарчы разрахунак зроблен падлік матар'ялу, якія знаходзіліся ў цэхах, але **інвэнтарызацыя абсталяваньня цэхаў ня была зроблена.** Як гэта ня дзіўна, **адміністрацыя цэхаў і бухгальтэрыя заводу ведуць аднолькавы ўлік работы цэхаў.** Дагаворы падпісаны **без папярэдняга абмеркаваньня на цэхавых сходах.** Толькі 20-га красавіка дырэктар заводу ўпяршыню зрабіў даклад на агульным сходзе рабочых лесапільнага і мэханічнага цэхаў аб пераводзе на гаспадарчы разрахунак.

Адказнасьць заводу перад цэхамі і цэхаў перад заводам выказана ў дагаворах у агульнай форме. Напрыклад, «заводакіраўніцтва абавязваецца забясьпечыць цэх паказанымі матар'ялямі ў паказанай колькасьці, інструментамі і бягучым рамонтам», «невыкананьне цэхам праграмы, або перавыдатак пры яе выкананьні супроць устаноўленай капітарысам сумы можа выклікаць, **па мяркаваньнях заводакіраўніцтва(?) урэзкі** фінансаваньня, адпаведна невыкананьню», «цэх абавязваецца давесьці да мінімуму (?!) тэхнічныя прастоі і псаваньне варштатаў і матар'ялаў». Такія агульныя фармулёўкі сьведчаць аб **фармальным падыходзе** да заключэньня дагавароў паміж заводакіраўніцтвам і цэхамі.

Ударныя брыгады на гаспадарчы разрахунак **не пераведзены.** Пілкаў над рыхтоўкі ў гэтым напрамку не вядзецца.

Брыгада ЦКК і «Зьвязды»:
Н. РУСЕЦКІ, С. ПАСЕЧНІК.

Гаспадарчы разрахунак—у сельгаскаапэрацыю

У сыстэмах сельгаскаапэрацыі, пытаньне аб гаспадарчым разрахунку амаль ніколі не стаяла на першым пляне гаспадарча-апэрацыйнай работы. Яшчэ да першай рэарганізацыі сыстэмы (1928 г.) аношняя, пачынаючы ад былога Белсельсаюзу і акруговых сельсаюзаў і канчаючы с.-г. крэдытным таварыствам, ці сельгаставарыствам, менш за ўсё ў сваёй практычнай рабоце ставіла пытаньне аб гаспадарчым разрахунку, аб безлэфіцытнай рабоце. У выніку гэтага шмат мільёнаў даяржаўных сродкаў гэтай сыстэмай былі выдаткаваны **безгаспадарча і бязмэтава.** У сучасны момант, пытаньні гаспадарчага разрахунку ў с.-г. каапэрацыі пастаўлены ня ценш. За стратнасьць у рабоце ў цэлым радзе выпадкаў канкрэтнай адказнасьці ніхто да гэтага часу не нясе. У апошнія год-паўтара пытаньні бездэфіцытнасьці ў рабоце сыстэмы займалі вельмі мала месца, прамфінпляны асобных зьвеньняў сыстэмы ня выконваліся. Адсюль — новыя сотні тысяч рублёў страт у асобных арганізацыях.

Але апрача далёка нездавальняючай гаспадарча-апэрацыйнай работы ўсёй сыстэмы, якая выклікае дэфіцытнасьць яе, ёсьць і іншыя прычыны, якіх нельга абыйсьці моўчкі, ставячы пытаньне аб гаспадарча-разьліковай бездэфіцытнай рабоце сыстэмы.

Сыстэма с.-г. каапэрацыі праводзіць цэлы рад важнейшых мерапрыемстваў у галіне сельскай гаспадаркі, якія выклікаюць значныя выдаткі. Але гэтыя выдаткі ні ў адну з калькуляцый ня ўключаюцца і часта не пакрываюцца рэгулюючымі арганізацыямі.

Амаль штогод, пры правядзеньні весьнавой і асеньняй пасеўкампаніі, сыстэма с.-г. каапэрацыі БССР, пры забясьпячэньні сродкамі вытворчасьці, асабліва насенным матар'ялам, церпіць страты да мільёну рублёў, ня лічачы аргвыдаткі, якія цалкам і поўнасьцю кладуцца на сыстэму і ні ў адну з калькуляцый ня ўключаюцца. Гэтыя страты амаль ніколі адпаведнымі арганізацыямі не пакрываюцца поўнасьцю, а само пакрыцьцё выдаткаў, як правіла, робіцца пасьля 8-10 месяцаў, што на адных процантах за капіталы дае страты ў некалькі дзесяткаў тысяч рублёў.

У сувязі з пастановай СНК аб увядзеньні гаспадарчага разрахунку і фінансаваньня ўсіх гаспадарчых арганізацый не на пляне, а на цьвёрдым даходзе і ў межах яго выкананьня, усклаўшы пэрсанальную адказнасьць як за зрыў выкананьня дагавору, так і за гаспадарчую страту дзяржаўнай арганізацыі **— перад сыстэмай с.-г. каапэрацыі ва ўсю шырыню паўстае пытаньне аб гаспадарчым разрахунку, аб бездэфіцытнасьці ў рабоце, аб выкананьні прамфінпляну.**

Першае і асноўнае, што павінна паўстаць перад кожнай арганізацыяй сыстэмы с.-г. каапэрацыі, перад кожным асобным работнікам, — гэта ... і мільёны рублёў, вылічваючы з гэтага даходную частку прыбыткова-выдатковага каштарысу, робячы выдаткі на гэтым каштарысе бяз усякай эканоміі, а часта нават з перавыдаткамі, выконваючы пляны загатовак і забясьпячэньня толькі на 30-40, максымум на 80 проц., сыстэма с.-г. каапэрацыі дае вялізарнейшыя страты. У сувязі з урадавай пастановай аб гаспадарчым разрахунку, сыстэма с.-г. каапэрацыі **павінна рашуча перабудаваць сваю работу** з тым, каб у першую чаргу апэрацыйныя пляны, як па забясьпячэньні, так і па загатоўках **выконваліся поўнасьцю.** Асобы, якія непасрэдна ведаюць гэтай работай — **павінны за зрыў іх несьці ня толькі маральную, але і матар'яльную, і нават крымінальную адказнасьць.** Выдатковыя часткі каштарысаў павінны быць абмежаваны да мінімуму і **ні адзін выдатак, не прадугледжаны каштарысам, не павінен мець месца.** Пытаньні сваячасовага афармленьня разрахунку маюць немалаважнае значэньне — асабліва ў апошні год, калі сыстэма фінансаваньня апэрацыйнай работы не аказвала амаль ніякага націску ні на адно са зьвеньняў сыстэмы. Як правіла, рахункі на адпраўлены тавар выпісваліся з вялікім спазьненьнем, іншы раз пасьля 3-5 месяцаў і таму на адных процантах за капітал ужо нарасталі вялікія выдаткі, рахункі-ж на тавары забясьпячэньня паступалі пасьля 5-6 месяцаў і ва многіх выпадках тавары ляжалі бяз руху, а кантакарэнт у Дзяржбанку ўсё павялічваўся. Гэта прывяло да таго, што Дзяржбанк быў прымушан спыніць крэдытаваньне асобных арганізацый.

У асабліва кепскім становішчы знаходзілася і знаходзіцца справа з рэалізацыяй таварных каштоўнасьцяй. У асобных райкаапсаюзах таварныя запасы дасягаюць да 100.000 руб. Сыстэма нясе выдаткі за процанты на капітал, а таварныя запасы, часта дэфіцытныя, не паступаюць у зварот і выклікаюць фінансавыя затрудненьні на рынку. Гэтыя недахопы цалкам і поўнасьцю залежаць ад самой сыстэмы і ад асобных яе работнікаў. Гэты прабел **павінен быць безадкладна ліквідаваны.** Гэтага патрабуе гаспадарчы разрахунак і бездэфіцытнасьць у рабоце.

Што-ж датычыць дэфіцытных апэрацый у сыстэме сельскагаспадарчай каапэрацыі, якія выкліканы на віне самой сыстэмы, дык яны адпаведнымі органамі **павінны быць адхілены.** У прыватнасьці рэалізацыя пасеўнага насеньня, што і ў гэтым годзе дасьць каля 200 тыс. рублёў страты — выклікана, галоўным чынам, з прычыны разрыву цэн паміж загатоўчымі і рэалізацыйнымі цанамі. Гэтыя выдаткі павінны быць пакрыты адпаведнымі арганізацыямі, рэгулюючымі цэны. Вымяраючы кожную апэрацыю рублём — ... да ... да сяўбы.

Арк. ЗАРУБЕЖНЫ.

Лесбел скончыць дагаворную кампанію

ТОЛЬКІ У КАНЦЫ МАЯ

Лесбел, як вядома, зьяўляецца адзінай у БССР арганізацыяй па дастаўцы лесу, лесаматар'ялаў і вырабе іх. Яму падпарадкаваны 26 дрэваапрацоўчых заводаў і 35 леспрамгасаў. Здавалася, што такая значная колькасьць прадпрыемстваў і маштаб работы павінны былі прымусіць Лесбел **больш уважліва адносіцца да дагаворнай кампаніі.** Аднак, да 20-га красавіка Лесбел усю кампанію праводзіў **без удзелу грамадзкасьці.** Толькі ў часе абсьледваньня брыгады ЦКК і «Зьвязды», па ініцыятыве апошняй, было пастаўлена пытаньне аб дагаворнай кампаніі на чарговым агульным сходзе служачых Лесбелу. Насьцепгазэта не асьвятляла ходу кампаніі. Шэфы Лесбелу—рабочыя заводу «Дрэваапрацоўшчык» — **ніякага ўдзелу ў гэтай рабоце не прынялі.** Выдучэньне адказных асоб па заключэньні дагавароў было зроблена позна і бяз удзелу грамадзкасьці і прафарганізацыі. Пастанова адміністрацыі аб разьмеркаваньні абавязкаў дайшла да паасобных сэктароў **толькі 16-га красавіка.** Зразумела, што пры такіх умовах засталося вельмі мала часу для правядзеньня ўсёй практычнай работы.

У выніку Лесбел на 20-га красавіка меў вельмі нязначную колькасьць заключаных дагавароў. Па лесарасьпіловачным сэктары быў заключан толькі адзін дагавор з заводам «Камінтэрн». Паводле слоў працаўніка сэктару **Лічко,** да 8-га мая (!) будуць заключаны яшчэ 6 дагавароў, а ўся дагаворная кампанія па гэтым сэктары будзе скончана толькі ў канцы мая (!?).

Нарады-заказы ўзгоднены і падпісаны 8 леспрамгасамі. 13 леспрамгасам нарады пасланы. Такім чынам засталося яшчэ пасьлаць нарады 14 леспрамгасам, ня лічачы таго, што прыдасьцца, можа, некаторыя нарады перарабляць па атрыманьні заўваг з месц.

На збыт прадукцыі заключаны дагаворы з Белдзяржснабам, БВА, Беларускім кіраўніцтвам сувязі і Белсельбудам. Падрыхтован дагавор з Галоўдартрактам. **Затрымліваецца заключэньне дагавароў з запалкавым аб'яднаньнем і Белсампрамсаюзам.**

На збыт дроў заключаны дагаворы ўсяго на 3 млн. руб. На такую-ж суму павінны быць заключаны дагаворы непасрэдна мясцовымі арганізацыямі. **Затрымліваецца заключэньне дагавароў з Белсампрамсаюзам, Шкляаб'яднаньнем, Папераб'яднаньнем, запалкавым аб'яднаньнем, Камунэльным трэстам, Белбудканторай і Белкаапсаюзам, якія адмаўляюцца прыслаць у Лесбел сваіх прадстаўнікоў для ўзгадненьня і падпісаньня дагавароў.**

У галіне забесьпячэньня Лесбелу становішча наступнае: існуе генэральны дагавор з Белдзяржснабам на дастаўку тэхнічна - прамысловых тавараў, патрэбных прадпрыемствам Лесбелу. Ёсьць дагавор і з Белкаапсаюзам на абслугоўваньне лесарубаў. Заключан дагавор з Белдзяржбудам на дастаўку цэглы.

Толькі 18-га красавіка Лесаснаб даў тэлеграфнае даручэньне мясцовым гаспадарчым арганізацыям аб заключэньні пікальных умоў з аддзеламі Белдзяржсбу і Нафтаскладу.

Дагаворы па збыце і пераапрацоўцы заключаюцца ўсяго на тэрмін да **1-га ліпеня 1931 г. (?!)**

Вельмі дрэнная справа з падрыхтоўкай да складаньня балянсу на 1-ы красавіка. **Да гэтага часу няма заключнага балянсу Лесбелу на 1-га кастрычніка 1930 г.** Няма заключных балянсаў ад былых лесараёнаў: да гэтага часу прыслалі балянсы толькі два, а чакаецца яшчэ ад 7, прычым чатыры выканалі работу часткова, прыслаўшы справаздачныя калькуляцыі. Асабліва адстаюць **Віцебскі і Полацкі лесараёны.** Балянсы за асобны квартал атрыманы **ад 8 раёнаў. 8 заводаў да гэтага часу балянсаў ня прыслалі.**

Значную дапамогу па складаньні балянсаў аказвае брыгада Саюзлеспраму. Удзельнікі гэтай брыгады ў колькасьці 12 чалавек чацьверты месяц працуюць у 12 леспрамгасах. Трэба адзначыць, што з боку ўсяго рахункова апарату Лесбелу і яго прадпрыемстваў наглядзецца нейкая **пасыўнасьць.** Сацспаборніцтва і ўдарніцтва адсутнічаюць. Былі выпадкі, калі рахунковыя працаўнікі лясных арганізацый перабягалі на работу ў іншыя установы. Барацьбы з лятунствам не відзець.

Брыгада ЦКК і «Зьвязды»:
Н. РУСЕЦКІ, С. ПАСЕЧНІК.

Заўком заводу імя Варашылава

АБ ПАСТАНОВЕ СНК НЯ ВЕДАЕ

Да 19-га красавіка 1931 г. адміністрацыя заводу імя Варашылава не заключыла ніводнага дагавору на забесьпячэньне. Галоўным дастаўшчыкам сырцу зьяўляецца «Югосталь». Прадстаўнік Белметаляаб'яднаньня, які зараз знаходзіцца ў Маскве, вядзе непасрэдныя пераговоры аб забесьпячэньні заводаў БССР сырцом. **Канкрэтных выкінаў яшчэ няма.**

На здачу прадукцыі заключаны дагаворы з Саюзтрансам, Нафтасындыкатам, Белхэмпрамам і іншымі ўстановамі, якія забясьпечваюць збыт прадукцыі на 20 проц. Рэалізацыя рэшты прадукцыі не забясьпечана. Па мяркаваньнях заводакіраўніцтва, трэба будзе заключыць яшчэ 5 дагавароў з іншагароднімі пакупцамі.

Апарат заводу да новых форм крэдытаваньня больш-менш падрыхтаваны. **Але зусім не падрыхтаваны грамадзкія арганізацыі.** Заўком да гэтага часу нічога не зрабіў і **аб пастанове СНК ад 11 студзеня і ад 20 сакавіка нават ня ведае.**

Балянс на 1-га красавіка будзе скончан 23-га красавіка. Запазычанасьць заводу банку ніжэйшая вызначанага ліміту (па 18-га красавіка запазычанасьць была 70.500 руб. пры ліміце ў 105.000 руб.).

Брыгадзір ЦКК і «Зьвязды»
БІРЫЛА.

У Бабруйску цікавяцца толькі бухгальтары

Ня гледзячы на тое, што з часу пастановы СНК ужо прайшло больш месяца, ні адно бабруйскае прадпрыемства не абмеркавала гэтага пытаньня на сходах рабочых або на пасяджэньнях заўкому. Парт'ячэйкі таксама не аддалі належнай увагі дагаворнай кампаніі.

Гаспадарнікі лічаць, што фінансавая справа датычыць толькі бухгальтэрыі. Характэрна, што калі РСІ склікала 19-га красавіка нараду, дык зьявіліся ў большасьці бухгальтары, а Камунтрэст, Прамтраст і Сампрамсаюз нават нікога ня прыслалі.

Апрача Саюзтрансу і Белснабу, бабруйскія прадпрыемствы не прыступілі да гэтай работы. Ёсьць пагроза, што **да 1-га мая значная частка ўстаноў і прадпрыемстваў ня скончыць заключэньня дагавароў.** У некаторых кіраўнікоў устаноў і прадпрыемстваў (ЦРК, завод імя Сталіна) ёсьць думка, што яны да 1-га мая ня справяцца з гэтай работай, **і таму не сьпяшаюцца.**

У справе пераводу на гаспадарчы разрахунак цэхаў і агрэгатаў нічога ня робіцца. Многія прадпрыемствы чакаюць паказаньняў і дырэктыў ад цэнтральных устаноў, але гэта не павінна зьявіцца падставай для зрыву дагаворнай кампаніі.

І. Донін.

Наглая вылазка рвачоў на заводзе „Камунар"

ЛЕПШЫ УДАРНІК, ЯКІ ВЫКРЫЎ СЫМУЛЯНТАЎ,—ПАД БАЙКОТАМ

ЗАВОДЗКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ НЕДАЦАНІЛІ ПАЛІТЫЧНАГА ЗНАЧЭНЬНЯ ГЭТАГА ФАКТУ

Даць рашучы і бязьлітасны адпор рвачом, якія зрываюць кампанію перагляду норм і расцэнак!

Апартуністычная недацэнка многімі гаспадарчымі і прафсаюзнымі арганізацыямі БССР вялікага палітычнага значэньня перагляду норм і расцэнак зьяўляецца асноўным тормазам у разгортваньні гэтай кампаніі. Мы ўжо прыводзілі рад фактаў (гл. «Зьвязду» №№ 93 і 108) апартуністычнага самацёку і грубых скажэньняў на многіх прадпрыемствах.

Падзеі на менскім машына-будаўнічым заводзе **«Камунар»** кажуць яшчэ аб тым, што недацэнка палітычнага значэньня гэтай кампаніі і **невыстарчальная масавая работа з боку заводзкіх арганізацый** разьвязваюць рукі найбольш адсталым групам рабочых, якія, у процівагу імкненьню ўдарнікаў выстаўляць сустрэчныя павялічаныя нормы і забясьпечыць выкананьне прамфінпляну, прад'яўляюць рвацкія патрабаваньні аб зьніжэньні норм.

На заводзе «Камунар» гэтым рвачэньнем патрабаваньні адной з брыгад бляшанага цэху не сталі брыгад бляшанага цэху не сталі рашучага адпору заводзкіх арганізацый, таму рвачы пастаўлены абмеркаваць, што **абвясьцілі форменны байкот пепшаму ўдарніку, які выступіў супроць іх, і прымусілі яго вынесьці з гэтай брыгады.**

У спрадвіне сакавіка завод «Камунар» атрымаў заказ на 270.000 бляшаных лёек для падсочнай прамысловасьці. Заказ — тэрміновы, зьвязаны з сэзоннай адмаўчай экспартнай прадукцыі. Брыгада Зільбэрта рапорта, што на гэтай справе можна добра заработаць. Сам кіраўнік брыгады Зільбэрт (член партыі) аказаўся далучыўся да групы рвачоў, горача абараняючы іх беспадстаўныя патрабаваньні. Штучна зьніжаючы прадукцыйнасьць працы, цэлымі гадзінамі ходзячы бяз працы, рвачы імкнуліся даказаць, што норма ў 836 шт., устаноўленая хранамэтражам, непасільная, што яе выканаць ні ў якім выпадку нельга, што таму іх заработак ледзь дасягае 2 р. у дзень.

Ударнік гэтай брыгады — член партыі тав. Гольдфарб Самуіл рашуча выступіў супроць гэтых рвацкіх патрабаваньняў, ня толькі на справе даводзячы рэальнасьць устаноўленай нормы, але і выкрываючы канкрэтных сымулянтаў, не жадаючых працаваць. Мала таго, тав. Гольдфарб хутка знайшоў спосаб **пераўтварыць** ... мест 40 сэкунд пачаў затрачваць 15-20 сэкунд, г. зн. **павялічыў прадукцыйнасьць у два разы.** Гэта яшчэ больш разлавала рвачоў. Па ініцыятыве Зільбэрта пачалося цкаваньне Гольдфарба. «Ты працуеш з натугай, каб прыжаць усіх рабочых» — крычаў яму Зільбэрт. «Ты хочаш зарабіць прэмію», «хочаш выслужыцца», «ты-ж вар'ят», «ты ліжэўдарнік, толькі псуеш прадукцыю» — так выдаскваліся рвачы з Гольдфарба, ня гледзячы на тое, што Гольдфарб працаваў спакойна, без рыўкоў і даваў **пепшую па якасьці прадукцыю,** чым хто-небудзь іншы з брыгады.

Не задаволіўшыся гэтым, Зільбэрт пацкаваў на Гольдфарба самага адсталага ў брыгадзе рабочага **Давідава,** які, вылаяўшы Гольфарба, патрабаваў, каб ён пакінуў брыгаду. Гольдфарб вышаў з брыгады і перанёс свой варштат на іншае месца.

**Гэты абурачы факт цкаваньня ўдарніка не прыцягнуў увагі ні сакратара цэх'ячэйкі Бельскага, ні старшыні цэхпраф

МЕНСК ПАСЬЛЯ ПАВОДКІ

ЭЛЬВОД НАПЯРЭДАДНІ ПУСКУ

Учора на пасяджэньні прэзыдыуму гарсавету дырэктар Эльводу тав. **Позьняк** зрабіў даклад аб падрыхтоўцы да пуску Эльводу.

У асноўным уся вада з Эльводу ўжо выпампавана. Крыху прасочваецца яшчэ вада ў старой кацельні. Паводле меркаваньняў тав. Позьняка ўчора ўвечары ўжо павінна была быць пушчана нямецкая турбіна магутнасьцю ў 1.500 кілёват. У першую чаргу энэргія будзе дана прамысловасьці і для асьвятленьня гораду. Праз некалькі дзён будзе пушчана другая турбіна магутнасьцю ў 1.000 клв.

Прэзыдум гарсавету разьмеркаваў усю наяўную колькасьць электра-энэргіі наступным чынам: электраўстаноўка гарбарні **«Бальшавік»** адпускае энэргію **заводу імя Варашылава**, электраўстаноўка заводу **«Дрэваапрацоўшчык»** — **друкарні «Зьвязда» і Барысаўскай вадаправоднай шчыліне, Эльвод** адпускае заводу **«Камунар»** 100 клв., фабрыцы **«Кастрычнік»**—100 клв., **друкарні імя Сталіна** — 50 клв., **абутковай фабрыцы**—50 клв. Апрача таго Эльвод павінен забясьпечыць энэргіяй **хлебазавод, радыё-цэнтр, халадзільнік і ст. чыгункі.** Для асьвятленьня гораду Эльвод дасьць 400 кілёват. 200 кілёват ідзе на пуск трамваю. Гарсавет прапанаваў Эльводу пусьціць 10 трамвайных вагонаў па лініі таварная МББ — Камароўка.

5.000 руб.—дзецям пацярпеўшых ад паводкі

ПРЭЗЫДЫУМ ЦЭНТРАЛЬНАЙ КАМІСІІ ДАПАМОГІ ДЗЕЦЯМ ПРЫ ЦВК БССР АДПУСЦІЎ 5.000 РУБ. (ГРАШЫМА І АБМУНДЗІРАВАНЬНЕМ) НА АКАЗАНЬНЕ ДАПАМОГІ ДЗЕЦЯМ ПРАЦОЎНЫХ ГОР. МЕНСКУ, ПАЦЯРПЕЎШЫХ АД ПАВОДКІ.

Да 1 мая закончыць рамонт мастоў

Прэзыдыум гарсавету прапанаваў Камгасу закончыць у асноўным да першага мая рамонт мастоў, вуліц, дамоў, двароў і дробны рамонт кватэр тых, якія пацярпелі ад паводкі.

Камгас арганізуе рамонтныя брыгады для адрамантаваньня вуліц. У першую чаргу павінны быць адноўлены масты на **Пралетарскай** вуліцы і **трамвайны**. Для рамонту адпускаецца лес і цэгла.

Зьнішчыць бюракратызм у водпуску хлеба пацярпеўшым ад паводкі

Праўленьне МЦРК увяло бюракратычны парадак выдачы хлеба пацярпеўшым ад паводкі. Для атрыманьня хлеба патрэбна спэцыяльная паперка і на ёй спэцыяльная рэзалюцыя. Даведкі ад міліцыі аб тым, што такі-та працоўны пацярпеў ад паводкі не сапраўдны для бюракратаў з МЦРК. Пацярпеўшы ад паводкі тав. **Барсук** зьвярнуўся ў краму № 158 МЦРК з просьбай адпусьціць хлеб. Пры гэтым ён прад'явіў даведку ад міліцыі, што ён і яго сям'я сапраўды пацярпелі ад паводкі. Але загадчык крамы і слухаць не хацеў. — Дайце мне адносіну з рэзалюцыяй МЦРК — інакш хлеба ня выдам — заявіў ён.

Трэба зараз-жа зьнішчыць гэты бюракратычны парадак у водпуску хлеба пацярпеўшым ад паводкі.

Г.

Абутковая фабрыка ліквідуе прарыў, створаны паводкай

Рабочыя МЕНСКАЙ АБУТКОВАЙ ФАБРЫКІ пастанавілі адпрацаваць 2-е мая і выкарыстаць усе перапынкі паміж аднэй і другой зьменамі на працягу другога кварталу для ліквідацыі прарыву, створанага ў сувязі са спыненьнем работы ў часе паводкі

На Дзьвіне становішча ўскладняецца

Біцца за захаваньне кожнага экспартнага бервяна

ВУЛЬЛЯ. (Ш-м. кар.). Разьліў Дзьвіны нябывалы. Значная частка Вулы пад вадой. 24-га красавіка а 9 гадзіне вечара назіраўся значны ўздым вады. Камісія па барацьбе з паводкай працуе бесьперапынна. Ідзе высяленьне жыхароў у бясьпечныя месцы.

Вёскі Чарчыцы, Убойна, Рагішчыцы заліты вадой, у сувязі з чым пагражае пагроза чалавечых ахвяр.

У выніку бюракратычных адносін Полацкага леспрамгасу да справы замацаваньня лесу (толькі 24-га красавіка пачалося замацаваньне), экспартны лес плавае. 30 тысяч кубамэтраў пад пагрозай. У Шашынскім руме назначная частка лесу ўплыла. Прымаюцца энэргічныя меры да ліквідацыі небяспекі, якой пагражае паводка.

Мікуцкі.

Падрыхтованы да выхаду ў поле.

Злачынствы на ст. Старушка

Насеньне канапель, якое прыбыло на станцыю СТАРУШКА для саўгасу імя 10-годзьдзя БССР, начальнік станцыі загадаў выгрузіць і пакінуць пад адкрытым небам. Не дапамаглі просьбы экспедытараў саўгасу, каб гэта насеньне пагрузіць у цяплушкі і накіравць у саўгасы. Насеньне на працягу 3-х дзён мокла пад дажджом.

З-за галавацяпства адміністрацыі чыгункі, саўгас атрымаў на так званыя прыспэшныя машыны, якія былі прызначаны для саўгасаў БІГОСАВА і БОРКАВІЧЫ.

Б-СКАЯ.

Аб новым прыёме асьпірантуры ў інстытут асьпірантаў камуністычнага універсытэту нацыянальных меншасьцей Захаду імя Ю. Ю. Мархлеўскага пры „НАІЗ" на 1931-1932 г.

1. Інстытут асьпірантаў пры КУНМЗ мае на мэце падрыхтоўку выкладчыкаў грамадзкіх дысцыплін (эканамічныя навукі, усеагульная гісторыя, гісторыя УсеКП(б), ленінізм) з адпаведнай расцраўкай адпаведных нацыянальных праблем — для нацыянальных адділеньняў пры камвузах і пасасўпарт-школах. Тэрмін прабываньня ў інстытуце — 3 гады.

2. На 1931-32 навучальны год ў складзе інстытуту будуць функцыянаваць групы: польская, яўрэйская, беларуская, літоўская, латыская, нямецкая і баўгарская.

3. У інстытут асьпірантэў прымаюцца асобы, якія маюць ня менш 5-цігадовага партыйнага стажу і якія могуць весьці выкладчыцкую работу на адной з моваў, пералічаных у п. 2, скончыўшыя ВНУ, камвуз, або маючыя веды ў абсяге камвузу і маючыя вопыт выкладчыцкай, або прапагандысцкай работы. Пры іншых розных умовах рабочыя і скончыўшыя КУНМЗ карыстаюцца перавагай.

ЗАЎВАГА: Для ўсіх паступаючых, скончыўшых ВНУ або камвуз, абавязковы двугадовы стаж практычнай работы паміж сканчэньнем навучальнай установы і паступленьнем у інстытут асьпірантаў.

4. Кандыдаты ў інстытут асьпірантаў на 1931-32 навуч. год абавязаны падаць у КУНМЗ не пазьней 1 мая 1931 году наступныя дакументы: 1) камандыроўку Культпрому ЦК УсеКП(б), краявых або абласных камітэтаў УсеКП(б); 2) заяву з указаньнем выбранай спэцыяльнасьці і нацыянальнай групы; 3) кароткую аўтабіяграфію з засьведчаным партстажам; 4) пасьведчаньне аб сканчэньні камвузу або ВНУ; 5) копію вайсковага дакумэнту; 6) заключэньне мэдыцынскай камісіі аб стане здароўя; 7) друкаваныя работы (калі яны ёсьць); 8) партыйную характарыстыку.

5. Жадаючыя паступіць у інстытут асьпірантаў, дапушчаныя мандатнай камісіяй да прыёмных іспытаў, аб чым сваячасова ім паведамляецца, павінны падаць у КУНМЗ не пазьней і жніўня пісьмовы работы на свабодна выбраную тэму на сваёй спэцыяльнасьці на адной з моваў, пералічаных у п. 2.

У выпадку прызнаньня работы здавальняючай, кандыдаты падлягаюць на між 15 жніўня і 1 верасьня абавязковым для ўсіх паступаючых вусным іспытам на дыялект. матэрыялізме, палітэканоміі, гісторыі УсеКП(б), гісторыі класавай барацьбы (усеагульная гісторыі) і гісторыі народаў СССР. Канчатковае прыраньне аб прыёме кандыдатаў выносіць праўленьне універсытэту. Праграма і сьпіс літаратуры, неабходнай для падрыхтоўкі да прыёмных іспытаў у асьпірантуру, высылаюцца універсытэтам па запытаваньні. Зварачацца ў навучальную частку камуністычнага універсытэту нацыянальных меншасьцей Захаду (Масква, Маросейка, Петраградзкі завулак, № 10).

6. Слухачы інстытуту асьпірантаў забясьпечваюцца за кошт НАІЗ стыпэндыяй у разьмеры 200 руб. у месяц, агульным памяшканьнем і літаратурай для навуковай работы. Універсытэт не бярэ на сябе ніякіх абавязкаў па забесьпячэньні сям'і асьпірантаў.

7. Усе асобы, дапушчаныя мандатнай камісіяй да прыёмных іспытаў, атрымліваюць для падрыхтоўкі за кошт месцовых арганізацый двухмесячны водпуск з захаваньнем утрыманьня.

Старшыня «НАІЗ» і рэктар КУНМЗ.

Заг. інстытутам асьпірантуры пры КУНМЗ.

Паліўка саду.

ХРОНІКА

Усебеларускі зьезд навуковых работнікаў

4-га мая ў Менску адкрываецца III Усебеларускі зьезд навуковых работнікаў. На парадку дня зьезду наступныя пытаньні: аб міжнародным і ўмутраным становішчы; справаздача Цэнтральнага Бюро сэкцыі навуковых работнікаў СССР (дакл. тав. ВЭГЕР); Варнітса і навуковыя работнікі (дакл. т. СЬЮРДЛОЎ); справаздача ЦБ сэкцыі навуковых работнікаў БССР (дакл. т. ВАЛЬФСОН); асноўныя пытаньні вышэйшай школы (дакл. тав. ПЛАТУН); судаклады ВСНГ і НКЗему БССР;—аб навукова-дасьледчай рабоце ў БССР (дакл. тав. ГОРЫН) і выбары ЦБ сэкцыі навуковых работнікаў БССР.

Для выбараў дэлегатаў на Усебеларускі зьезд навуковых работнікаў па Менску, з 25-га да 28-га красавіка адбудуцца агульныя сходы навуковых работнікаў па паасобных вучастках.

Новы прэзыдыум Белтарнітса

Пасьля перарэгістрацыі адкавіла сваю дзейнасьць беларускае таварыства садзейнічаньня сацыялістычнаму будаўніцтву— **БЕЛТАРНІТСА.**

БЕЛТАРНІТСА ператвараецца ў масавую арганізацыю, якая павінна аб'яднаць перадавую частку рэвалюцыйнай савецкай інтэлігэнцыі — навуковых работнікаў, інжынэраў, дактароў, настаўнікаў, агранамаў і г. д.

На бліжэйшы час галоўнай мэтай арганізацыі зьяўляецца барацьба за ажыцьцяўленьне сталінскага дэкрэту аб аўладаньні тэхнікай.

На арганізацыйным сходзе таварыства, які адбыўся 16-га красавіка, абраны прэзыдыум БЕЛТАРНІТСА ў складзе наступных т. т.: **Вальфсон** (старшыня), **Гершэльман** (адказны сакратар), акадэмік **Кроль, Васюцінскі,** інжынэр **Тацьянак,** рабочы-ўдарнік **Пілітовіч,** доктар **Левінтава** і **Наўмёнак.**

Таварыства мяркуе ў бліжэйшы час адкрыць сетку аддзяленьняў па ўсёй БССР.

***

У пачатку мая на сходзе навуковых работнікаў Менску, генэральны сакратар ВАРНІТСА тав. **Сьюрдлоў** зробіць даклад на тэму: **задачы ВАРНІТСА ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі.**

Дамы для дзяцей палітзьняволеных

ЦК МОПР'у БССР у сваёй дырэктыве ўсім візавым арганізацыям МОПР'у прапанаваў шырока скарыстаць першамайскія сьвяты для пачатку кампаніі збору сродкаў на пабудову дзяцячых інтэрнацыянальных дамоў для дзяцей палітзьняволеных і замежных рэвалюцыянэраў.

З гэтай мэтай па БССР будзе праведзен спэцыяльны збор.

Напярэдадні VII Усебеларускага зьезду прафсаюзаў

Прэзыдыум ЦСПСБ пастанавіў у бліжэйшыя дні зьвярнуцца з лістом да ўсіх членаў прафсаюзаў аб падрыхтоўцы да VII Усебеларускага зьезду прафсаюзаў.

26-га красавіка адбудзецца **сход прафактыву** з удзелам прадстаўнікоў ад Віцебску, Гомеля, Магілева, Воршы, Рэчыцы і Бярысава.

10-га мая будзе праведзена правёрка становішча падрыхтоўкі да зьезду. У правёрцы прымуць удзел рабочыя—добраахвотнікі.

Мяркуецца правесьці вылазку фізкультурнікаў на ўсе прадпрыемствы Менску і ў асобныя саўгасы і калгасы з мэтай правядзеньня падрыхтоўчай работы да Усебеларускага зьезду прафсаюзаў.

Падрыхтоўка да зьезду ўвязваецца з правядзеньнем першамайскіх сьвят. Прэзыдыум даручыў Культсэктару ЦСПСБ распісаць інструкцыйную нараду клубных і культработнікаў, а таксама рэдактароў насьценгазет і шматтыражак па пытаньні аб мастацкім афармленьні і упрытожаньні клубаў, абслугоўваньні VII зьезду прафсаюзаў і асьвятленьні яго работы ў друку.

Бесьперапынны навучальны год

Наркамасьветы пастанавіў перавесьці на бесьперапынны навучальны год: 10 двухкамплектных школ; па адной чатырохкамплектнай школе і па адной школе калгаснай моладзі ў кожным раёне і 1 ФЗС у Менску, Гомелі, Віцебску, Магілеве, Рэчыцы, Барысаве, Вабруйску і Воршы.

У 1931-32 г. будуць пераведзены на бесьперапынны навучальны год у асноўным усе пачатковыя школы (апрача 1-камплектавых), ПКМ і ФЗВ.

У школах, пераведзеных на бесьперапынны навучальны год будзе ўстаноўлена сымэтрычная сыстэма з двума прыёмамі і выпускамі. Першы прыём—у пачатку навучальнага году—1-га верасьня, другі—пасьля скавчэньня першага сымэстру—1-га сакавіка. Першы выпуск—15-га лютага, другі—15-га жніўня.

Першы перапынак на працягу навучальнага году—з 21-га па 30-га лістапада, другі—з 21-га лютага па 1-га сакавіка, трэці—з 1-га па 10-га чэрвеня і чацьверты з 21-га жніўня да 1-га верасьня.

У сярэдніх і вышэйшых навучальных установах будуць устаноўлены авіяцыйныя тэрміны прыёмаў і выпускаў, як і ў масавых школах: першы прыём—1-га верасьня, другі—1-га сакавіка; першы выпуск—1-га жніўня, другі—1-га лютага.

У сярэдніх і вышэйшых навучальных установах тэрмін навучаньня—32 рэкады ў год пры 7-дзённым рабочым дні, уключаючы сходы і лягерны збор.

Ачысьціць заслаўскую каапэрацыю ад шкоднікаў

Пракуратура Заслаўскага раёну выявіла, што апарат **райспажыўтаварыства** засьмечан чужым, злачынным элемэнтам. Самазабесьпячэньне, пьянкі і растраты былі звычайным зьяўленьнем у рабоце каапэрацыі. Праўленьне РСТ добра ведала аб гэтым, але патурала растратчыкам і п'яницам, вылучаючы іх на больш адказную работу.

У загадчыцы заслаўскай крамы № 1 **Бялэўскай** знойдены дзьве кампэрацыі ня ніжэй на 11 едакоў, у сапраўднасьці ж сям'я Бялэўскай складаецца з 6-ці едакоў. Акрамя таго, у яе знойдена звыш 200 мэтраў малуфактуры. Загадчык Траскоўскай крамы **Ашукевіч** трымаў увесь час цесную сувязь з кулакамі — выдаваў ім дэфіцытныя тавары. Зараз Ашукевіч высунут на работу старшынёй **Шаршунскага** сельспажыўтаварыства. У загадчыка Ратоўскай крамы **Дразд віча** знойдзена 100 мэтраў малуфактуры, пяць пар новых ботаў і 30 пак панчос. У сьнежні 1930 г. гэты-ж Драздовіч растраціў 1.300 руб. Растрату выкрыла бухгальтэрыя, але праўленьне замазала справу, дазволіўшы яму паступова выплачваць растрату. У крамніка **Ляўковіча** пінчынскага — знойдзена 5 пар новых ботаў, 5 пар галёш, 26 шпулек нітак і 50 мэтраў малуфактуры. Загадчык Слабодзкай крамы **Абрамчык** сыстэматычна п'янствуе ў часе работы, за прыладкам.

Старшыня РСТ Храпоўскі зараз зьнят з работы, але апарат яшчэ пакуль засьмечаны. Злачынны зрыўшчыкі плянавага рабочага забесьпячэньня павінны быць выкінуты са спажывецкай каапэрацыі.

П.

Архівы--на службу сацыялістычнаму будаўніцтву

Органы Цэнтральнага Архіўнага Кіраўніцтва БССР за час свайго існаваньня правялі вялікарную работу на зьбіраньні і захаваньні архіўных матар'ялаў. У сучасны момант у архівохах БССР захоўваецца каля 4 мін. спраў і дакумэнтаў. Архіўныя фонды БССР зьяўляюцца надзвычай цэннымі як з навукова-дасьледчага, так і з палітычна-гаспадарчага боку.

На працягу апошняга году архіўнымі органамі выяўлена шмат каштоўных матар'ялаў. **Гомельскім** аддзяленьнем Цэнтраархіву выяўлены матар'ялы па с.-г. мэліярацыі, здабычы торфу і іншых гідра-тэхнічных работах.

Менскі архіў знайшоў весткі аб дасьледзеньні і справаздачы па асушці так званых «Пінскіх балот» і іншых балотных масывах, шмат каштоўных матар'ялаў па камунальнай гаспадарцы і г. д.

Уся работа архіўных органаў праходзіла ў вельмі непрыяльных матар'яльна-тэхнічных умовах. Увесь час адчуваўся востры недахоп кваліфікаваных работнікаў. Трэба адзначыць, што грамадзкая думка ня была мабілізавана вакол работы Цэнтраархіву.

Зараз мы павінны ўзьняць архіўную справу на вышэйшую ступень, трэба накіраваць усю работу сыстэмы Цэнтраархіву на абслугоўваньне задач разгорнутага наступленьня сацыялізму па ўсім фронце. Асноўныя задачы архіўных органаў: забясьпечыць хуткае выяўленьне і максымальна-эфэктыўнае скарыстаньне архіўных матар'ялаў адпаведнымі гаспадарчымі арганізацыямі; папярэдзіць выкарыстаньне архіўных матар'ялаў для разгортваньня камуністычнай агітацыі і прапаганды, для практычнага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі.

Заключнай стадыяй усёй архіўнай справы зьяўляецца **публікацыя дакумэнтаў.** Гэта работа павінна выконвацца органамі архіву разам з зацікаўленымі ведамствамі і навукова-дасьледчымі ўстановамі. Шырокая пастаноўка і хуткія тэмпы развіцьця навуковай публікацыі дакумэнтаў дыктуюцца вострай неабходнасьцю ўзмацненьня навукова-дасьледчай распрацоўкі архіўных матар'ялаў маладымі навуковымі кадрамі на асновe марксыцка-ленінскага мэтаду. Публікацыя дакумэнтаў забясьпечыць, па-першае, пралетарскай грамадзкасьці рэальную магчымасьць правяраць навукова-дасьледчую работу. Па-другое, яна паскавіць навуковых работнікаў неабходнасьцю сядзець у архіўных органах і шукаць тыя ці іншыя архіўныя матар'ялы.

Важнейшай задачай зьяўляецца арганізацыя пасавага і сыстэматычнага кантролю над работай архіўных органаў з боку пралетарскай грамадзкасьці. Трэба наладзіць цесную і пастаянную сувязь архіўных органаў з шырокімі масамі рабочых і працоўных.

Толькі пры гэтай умове можна будзе зрабіць архіўную справу вострай зброяй сацыялістычнага наступленьня, важнейшым сродкам мабілізацыі мас на барацьбу за генэральную лінію партыі.

А. ЕДКА.

Новай магутнай хваляй сацспаборніцтва і ўдарніцтва спаткаем першамайскія сьвяты

Пад знакам барацьбы за прамфінплян трэцяга рашаючага

На заводзе імя Варашылава шырока разгорнута падрыхтоўка да першамайскіх сьвят і другой гадавіны сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Падрыхтоўка праходзіць пад знакам мабілізацыі рабочых мас на выкананьне прамфінпляну першага паўгодзьдзя трэцяга рашаючага году пяцігодкі і ліквідацыі прарыву першага кварталу. Падрыхтоўка да першамайскіх сьвят распачата з 15-га красавіка.

У цэхах, брыгадах і зьменах шырока разгорнута работа па арганізацыі новых ударных брыгад, вытворчых калектываў і камун імя першага мая, «другой гадавіны сацспаборніцтва і ўдарніцтва» і «518» і «1040».

На заводзе праводзіцца двухдэкаднік самаправеркі становішча сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Арганізаваны спэцыяльныя брыгады для правядзеньня самаправеркі.

Нядаўна адбылася нарада сакратароў цэхавых парт'ячэек і старшынь цэхкамітэтаў па пытаньні аб правядзеньні першамайскіх сьвят і другой гадавіны сацспаборніцтва. **Плян правядзеньня сьвята даведзен да кожнага рабочага.**

Прыступлена да агляду інтэрнацыянальна-выхаваўчай работы на заводзе з пункту погляду ўзмацненьня работы ячэйкі МОПР'у, уцягненьня ў рады МОПР'у новых членаў і г. д.

Заводзкая шматтыражка і пэхавыя насьценгазэты выпускаюць спэцыяльныя нумары газэт, прысьвечаныя першамайскім сьвятам. Бібліятэка папоўнена адпаведнай літаратурай і забясьпечаны ёю цэхавыя кінаноны. На пэхах вывешаны таксама рэкамэндацыйныя сьпісы літаратуры і адкрыты спэцыяльныя вітрыны.

30-га красавіка ў памяшканьні кіно «Культура» адбудзецца **зьлёт ударнікаў заводу,** прысьвечаны другой гадавіне сацспаборніцтва і першамайскім сьвятам.

1-га мая ў клюбе мэталістаў праводзіцца вечар рабочых разам з падшэфнымі калгасамі і вайсковымі часьцямі. Удзень наладжваецца масавае катаньне дзяцей рабочых на аўтамабілях і дзіцячы раніпік.

2-га мая арганізуецца масавы паход рабочых разам з падшэфнымі вайсковымі часьцямі ў падшэфныя калгасы.

Да першамайскіх сьвят прыстасаваны выпуск заводзкага **лікбезу** і праміяваньне лепшых слухачоў апошняга.

Н. Крайко.

***

ШКЛОЎ (наш кар.). Першага мая—у 11 гадз. раніцы адбудзецца ўрачыстае адкрыцьцё электрычнай падстанцыі Асінбуду на фабрыцы «СПАРТАК». У сьвяце прымуць удзел шырокія рабочыя масы.

Гарбары—да першамайскіх сьвят

На прадпрыемствах ГАРБАРНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ інтэнсыўна разгортваецца падрыхтоўка да першамайскіх урачыстасьцяй.

Ідзе праверка ажыцьцяўленьня лёзунгу тав. **СТАЛІНА—«аўладаць тэхнікай». Лепшыя гурткі па вывучэньні тэхнікі — прэміююцца.**

Падагульваюцца вынікі сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Лепшыя ўдарнікі прадстаўлены да ўзнагароды.

У адказ на заклік тульскіх рабочых арганізуюцца новыя ударныя брыгады і папаўняюцца існуючыя.

На фабрыцы «ПРАЦА» (Гомель) за апошні час арганізаваны тры новыя ударныя брыгады з 185 рабочых і адна вытворчая камуна.

Да 1-га мая на прадпрыемствах прыстасоўваюцца выпускі лікпунктаў.

Завод «БАЛЬШАВІК» 1-га мая наладжвае карнавал.

Прадпрыемствы гарбарнай прамысловасьці сустракаюць Дзень Міжнароднай Пралетарскай Салідарнасьці разгортваньнем сацспаборніцтва і ўдарніцтва, яшчэ большым узмацненьнем барацьбы за прамфінплян трэцяга рашаючага.

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

Сумныя вынікі „чарговасьці" кампаній

47,9 проц. квартальнага пляну

РАСНА, (наш кар.). Плян мабілізацыі сродкаў насельніцтва за першы квартал ганебна сарваны. Выканан ён толькі на 47,9 проц. Недабор складае 97.000 руб. Зрыў пляну ў асноўным ідзе па лініі добраахвотных плацяжоў, якія сабраны толькі ў разьмеры 36 проц. заданьня. Правал тлумачыцца тым, што мясцовыя арганізацыі мала што зрабілі, каб мабілізаваць увагу шырокіх мас вакол гэтай важнейшай палітычна-гаспадарчай кампаніі.

Сельсаветы і ўпаўнаважаныя РК ня могуць увязаць пасеўнай кампаніі з мабілізацыяй сродкаў і праводзяць на практыцы тэорыю «чарговасьці» кампаній. Калі згадчык ашчадкасы паставіў на прэзыдыуме сельсавету пытаньне аб вярбоўцы ўкладчыкаў, старшыня сельсавету адказаў: «Дай скончыць пасеўкампанію, тады і за твою справу возьмемся».

На працягу першага кварталу былі выпадкі адрыву фінработнікаў на розныя кампаніі. Тры работнікі банку з 6 былі мабілізаваны на пасеўную кампанію.

Дрэнна зьбіраючы ўступныя ўзносы, райкалгасаюз займаецца «очковтирательством». Не сабраўшы ў першым квартале ні адзінай капейкі, ён у зводках ставіць лічбу збору ўзносаў у асобным квартале.

Райфа, райкалгасаюз, райбанк зусім забыліся аб існаваньні ў раёне аднаасобных гаспадарак і не займаліся рэалізацыяй акцый Трактарацэнтру сярод аднаасобнікаў. У выніку заданьне па рэалізацыі акцый выканана на 7,5 проц. Даныя аб падпісцы на пазыку «Пяцігодка — за чатыры гады» сьведчаць аб прарывах у рэалізацыі пазыкі па сялянскім сэктары — на адну гаспадарку прыпадае 1 руб. Значная частка падпісчыкаў — сялян не аформіла падпіскі, аблігацыі за імі не замацаваны.

Раённая і сельская камісіі садзейнасьці існуюць толькі на паперы. Яны нічога не зрабілі, каб прымусіць кулакоў, шляхам грамадзкае ўзьдзейнасьці, кабыць аблігацыі пазыкі.

***

Улічваючы дрэннае становішча з выкананьнем пляну першага кварталу, раённыя арганізацыі павінны былі прыняць энэргічныя меры для выкананьня заданьня другога кварталу. Але плян мабілізацыі сродкаў у другім квартале з 19 па 27 сакавіка ляжаў у райфа, толькі ў пачатку красавіка плян быў разасланы па сельсаветах. Райкалгасаюз да 15-га красавіка не давёў заданьня да калгасаў.

Расьнянская арганізацыя мае значныя посьпехі ў галіне капектывізацыі сельскай гаспадаркі. Такіх-жа посьпехаў яна павінна дабіцца і ў адносінах мабілізацыі сродкаў.

СЬВЕТЛАЖАЛЕЗАЎ.

Няма ўліку выдаткаваньня апалу

МАГІЛЕЎ (наш кар.). Адбылася міжліпшная канфэрэнцыя ўдарнікоў Жлобінскага раёну. Канфэрэнцыя заслухала даклад памочніка начальніка раёну аб выкананьні адозвы ЦК і СНК.

У выніку прапрацоўкі адозвы ўдарнікамі адрамантавана звышчасова 6 паравозаў з гарачай і халоднай прамыўкай. Работніцы і хатнія гаспадыні **Магілева і Жлобіна** ачысьцілі ад бруду 27 паравозаў. Значна паленьнылася паравозная гаспадарка.

Ударнікі адначалі рад недахопаў, якія перашкаджаюць у рабоце. Няма ўліку выдаткаваньня апалу, прафарганізацыя не перабудавала сваёй работы. У **Магілеўскім дэпо** весткі аб эканоміі апалу ёсьць толькі за **чэрвень месяц 1930 году.** Адсутнасьць уліку перашкаджае правільнай пастаноўцы выдаткаваньня апалу.

На канфэрэнцыі было контр-рэвалюцыйнае выступленьне ідэйнадэрніка **Вакара,** які імкнуўся абараніць шкоднікаў. Канфэрэнцыя дала рашучы адпор агенту кулацкага ворага і мабілізавала ўвагу ўсіх рабочых-чыгуначнікаў на большую пільнасьць і выкрыцьцё шкоднікіх элемэнтаў.

Першамайская газэта „МОПР"

Гэтымі днямі выйдзе з друку першамайскі нумар газэты „МОПР".

Газэта прысьвечана, галоўным чынам, рэвалюцыйным пазыцям у краінах капіталу і адказу мопраўскіх арганізацый Савецкай Беларусі на адозву ЦК МОПР'у Зах. Беларусі.

У выданьні гэтага нумару газэты «МОПР» актыўны ўдзел прынялі беларускія пісьменьнікі. «МОПР» будзе мець 4 старонкі і выйдзе тыражом у 18.000 экз.

У нашарах, каля гіадрому ЗНОЙДЗЕНЫ ЗАМАЦАВАЛЬНЫЯ ТАЛЁНЫ ДА АБЛІГАЦЫЙ ВЫЙГРЫШНАЙ ПАЗЫКІ. Атрымаць у сакратара рэдакцыі газ. «Зьвязда».

У Ляднянскім раёне абараняюць кулака

За парушэньне клясавай лініі зьняты з работы старшыня Ляднянскага РВК

На апошнім пасяджэньні цацьвёрка ЦК і СНК па загатоўках заслухала даклады **Аршанскага, Расонскага, Рагачоўскага і Ляднянскага** РВК аб выкананьні пляну ільназагатовак. Чацьвёрка прызнала, што ільназагатоўкі па гэтых раёнах праходзяць нездавальняюча. Райкомам і РВК прапанавана прыняць усе меры да таго, каб узмацніць тэмпы загатовак і скончыць спагнаньне цьвёрдых заданьняў, даных кулацка-заможным гаспадаркам. Гэта работа павінна быць скончана не пазьней 25-га красавіка.

Ляднянскі РВК дапусьціў грубае парушэньне і скажэньне дырэктыў у адносінах дачы цьвёрдых заданьняў кулаком. Чацьвёрка прызнала, што дача кулацкім гаспадаркам заданьняў меншых, чым самаабавязацельствы бяднацка-серадняцкіх гаспадарак, зьяўляецца простай абаронай кулака.

За парушэньне дырэктыў чацьвёрка пастанавіла зьняць з работы старшыня Ляднянскага РВК.

Прарывы па спажывецкай сыстэме не ліквідаваны

Пералом у фінрабоце не дасягнут

У свой час, у адказ на выклік «Зьвязды», якая ўзяла на грамадзкі буксір работу спажывецкай каапэрацыі па мабілізацыі сродкаў, Белкаапсаюз абвясьціў увесь апарат спажывецкай каапэрацыі мабілізаваным па ліквідацыю прарываў. З таго часу прайшло больш месяцу. Аднак, дагэтуль, пералом не дасягнуты. Спажывецкая каапэрацыя ня выканала пляну мабілізацыі сродкаў першага кварталу і зрывае збор паёў і плацяжоў другога кварталу.

Весткі з месц страканяць дадымі аб дрэнным рабоце спажывецкіх таварыстваў.

Апарат **Расьнянскага** райспажыўтаварыства, замест баявой работы па мабілізацыі сродкаў, па каапэраваньні працоўнага насельніцтва займаўся «дамабілізацыяй» сродкаў—у радзе крам растрачана каля 30.000 руб.

Касьцюковіцкае сельскае таварыства, атрымаўшы 25-га сакавіка плян збору паёў за другі квартал, не давяло яго да паасобных крам. У выніку за першую дэкаду па ўсіх крамах сабрана 50 руб. паёў. Павоцле дырэктывы, рэшткі тавараў павінны складаць 95.000 руб., ёсьць-жа тавараў звыш чым на 250.000 руб.

Абсьледваньне апарату **Мазырскага** ПРК выявіла, што большасьць работнікаў каапэрацыі ня ўносяць самі паявых узносаў і мэтавых укладаў. Загадчык фэрмы ПРК Макрэцкі ня ўнёс 19 руб. паявых узносаў, сакратар праўленьня Барапоўскі вылічыў сабе пай з рахунку 68 руб. пэнсіі, у той час, як ён атрымлівае 110 руб. Галоўны бухгальтар Фінкаў, атрымліваючы 250 руб. пэнсіі, зусім ня быў пайшчыкам і ня ўносіў паёў, між тым ён атрымліваў усе дэфіцытныя тавары. Наогул, запазычанасьць па паёх за крамнікамі і служачымі — звыш 500 руб.

На складах Віцебскага ЦРК больш трох месяцаў ляжыць мазь на 8.000 руб., павідла па 30.000 руб., летнія шапкі—па 45.000 руб.; мёд—на суму звыш 10.000 руб. Больш паўгода валяцца ў крамах абутак толькі аднаго нумару па 30.000 руб. Праўленьне ЦРК ня лічвіцца работай крам і ня ведае, што ў яго робіцца, бо бухгальтэрыя адстае па 6 месяцаў.

Усе гэтыя факты сьведчаць, што ў рабоце каапэрацыі не ліквідавана апартуністычная недаацэнка фінансавай работы, што пастанова Белкаапсаюзу аб ударным месячніку ліквідацыі прарываў засталася ўрачыстай дэкларацыяй.

Спажывецкая каапэрацыя павінна зараз-жа пераключыцца на ўдарныя тэмпы работы. Яна займае падта вялікае месца ў агульным пляне мабілізацыі сродкаў, і нельга дапусьціць, каб з-за дрэннай работы спажывецкай сыстэмы зрывалася выкананьне фінпляну—базы сацыялістычнага будаўніцтва.

Каменскі сельсавет супаноіўся на дасягнутым

ПЛЕШЧАНІЦЫ. (Наш кар.). **Каменскі сельсавет** пішоў на першым месцы па загатоўках бульбы. Плян загатовак быў выканан на 84 проц. Аднак, на гэтым сельсавет супакоіўся. Далейшых мер для поўнага выкананьня заданьня ня прымаюцца. Між тым, кулацка-заможныя гаспадаркі ня выканалі да гэтага часу цьвёрдых заданьняў. Сельсавет не

Зараз сельсавет атрымаў дадатковы нарад на загатоўку 70 тон бульбы. Аднак, да гэтай работы нават і ня прыступілі.

А. Л.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

— Сьпіс т. т., вылучаных Менгаркомам КП(б)Б для правядзеньня дакладаў на прадпрыемствах аб 1-м маі: Валодзька—цяні, Яцкевіч—эксплятацыі, Кофцераў—пушці, Гурыновіч — «Полымя Рэвалюцыі», Шаранговіч—зав. імя Варашылава, Чарвякоў—зав. «Камунар», Галадзед—«Бальшавік», Міхайлаў—«ДА», Трус—«Беларусь», Ракаў—«Ударнік», Рудзіцкі—пута, Гутман—хэмфармзавод, Путынць—сьпіртазавод, Белашэўскі — хлебазавод, Каляда—малочны завод, Ган чароў—«Чырв. хэмік», Дубавіцкі—зав. «Пралетары», Саевіч—«Чырв. ворка», Хаскін—ф-ка «Кастрычнік», Міцькоў—абутк. ф-ка, Ляўкоў—шчотачн. ф-ка, Васкабойнікаў—«Беларуска», Любін — «Камунарка», Красіна—«Чырв. тэкстыльш.», Лынько—шчацін. ф-ка, Будзін—купэрная ф-ка, Каршакевіч—шпалерн. ф-ка, Гольдбэрг—ф-ка 8 сакавіка, Верба—ф-ка рымараў, Крывасоў—ф-ка імя Крупскай, Кучынскі—лямп. ф-ка, Васільеў—каўбасн. ф-ка, Рачыцкі—Эльвод, Цэнц